КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 24 (1150) 14 чэрвеня 2014 г.

Творы для новай экспазіцыі **музея вайны** С. 2

Адысці і... не вярнуцца на месца працы С. 4

А бібліятэка будучыні **не патрэбна?** С. 4, 7

Скульптура XXI стагоддзя: кірунак ці пошук? С. 9

Ля Чорнага мора: **эпапея Міхаіла Савіцкага** С. 15

САКРЭТЫ ПАЛАЦА ТЫЗЕНГАЎЗАЎ

У рамках XVII Міжнароднага фестывалю народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік" у Паставах адбудзецца адкрыццё першай чаргі музейнай экспазіцыі ў палацы Тызенгаўзаў, што размесціцца ў яго сутарэннях. Ужо сёння ў Паставах яшчэ больш даведаюцца пра мінуўшчыну гэтага краю...

Фота Пятра КУРЫЛОВІЧА

Чым Паставы вядомыя ў Еўропе?

Якімі былі парфорсныя паляванні?

Што хаваюць сутарэнні палаца Тызенгаўзаў?

Якія падзеі Першай сусветнай адбыліся на Пастаўшчыне?

С. 3

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Праекты развіцця

Хочаш даплату? Спявай!

"Эканоміка павінна быць эканомнай". Гэты лозунг, што ўпершыню прагучаў калісьці з вуснаў Леаніда Брэжнева пад час аднаго з партыйных з'ездаў, сцвярджаў, у першую чаргу, неабходнасць эканоміі ў краіне Саветаў. Але ж таксама і тое, што ў СССР з'явіліся фінансавыя праблемы і іх неабходна вырашаць новымі, непланавымі метадамі. Аптымізацыя, што цяпер поўным ходам ідзе ў сферы культуры Беларусі — у першую чаргу, у сельскай мясцовасці — таксама разлічана менавіта на эканомію дзяржаўных сродкаў. Але, як паказала наша нядаўняя размова з першым намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Святланай Баранок, эканомія тая — па факце не надта і вялікая (гл. "К" № 21 за 2013 г.). Больш важкая аддача сферы культуры, як аказалася, палягае ў іншым аспекце: у прадастаўленні платных паслуг насельніцтву.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Мінск — Лельчыцы — Мінск

Праверыць гэтыя словы не толькі ў тэорыі, але і на практыцы даволі лёгка. Варта выправіцца, напрыклад, у Лельчыцкі раён Гомельскай вобласці, што мяжуе з Украінай. Рэгіён гэты — сельскагаспадарчы, асаблівых турыстычных "фішак" тут не так ужо і багата, таму мясцовым культработнікам даводзіцца выкарыстоўваць незвычайныя формы працы, каб прывабіць да сябе самых патрабавальных наведвальнікаў.

Канкурэнцыя — не перашкода

На ўездзе ў Лельчыцы кожны падарожны можа сёння пабачыць, як на вялізным аб'екце завіхаюцца будаўнікі. Справа ў тым, што неўзабаве ў гарадскім пасёлку адчыніць дзверы буйны гандлёвы цэнтр. Як распавёў у размове са мной старшыня райвыканкама Аляксандр Капыткоў, ён доўга раздумваў над тым, ці варта дазваляць прыватнікам адкрываць гіпермаркет. Маўляў, вялізная канкурэнцыя для мясцовага райспажыўтаварыства. Але, паразважаўшы, пагадзіўся на праект, бо канкурэнцыя для мясцовага гандлю, на яго думку, — важная і нават патрэбная. Да таго ж, адна з умоў прыходу ў раён інвестара палягае ў тым, каб аказваць паслугі насельніцтву не толькі ў Лельчыцах, але і па ўсім раёне. "Такая самая канкурэнцыя, як я мяркую, павінна быць і ў аказанні платных паслуг у сферы культуры: прычым як у горадзе, так і на сяле", — не раз падкрэсліў пад час сустрэчы Аляксандр Капыткоў.

Трэба сказаць, што канкурэнтаў для культработнікаў у гарадскім пасёлку — больш чым дастаткова. Прыватнікі маюць тут шматлікія кафэ і рэстараны, дзе ладзяць разнастайныя мерапрыемствы: ад выступленняў заезджых музыкантаў да дыскатэк... А каля раённага Цэнтра культуры, напрыклад, часцяком працуюць дзіцячыя атракцыёны: гэта яшчэ адна "дзялянка", якую паспяхова "ўзаралі" мясцовыя бізнесмены. І маюць з яе неблагі прыбытак, бо, як слушна сцвярджае эканамічная тэорыя, попыт спараджае прапанову...

Але ж гэта не азначае, што мясцовыя культработнікі, так бы мовіць, сядзяць склаўшы рукі. Прыкладам, той жа Лельчыцкі раённы Цэнтр культуры можа пахваліцца многімі здабыткамі ў плане аказання платных паслуг насельніцтву. Па словах дырэктара ўстановы Аляксандра Раманава, у РЦК ладзяцца выстаўкі-продажы разнастайнай прадукцыі ад прыватных кампаній з Гомеля, Віцебска, Мінска. Арганізацыю і правядзенне мерапрыемстваў бярэ на сябе ўстанова. Вядома ж, за грошы.

Яшчэ адзін даволі паспяховы "грашовы" клопат — напісанне сцэнарыяў і арганізацыя святаў па адкрыцці прыватных крам. За адно такое "крама-шоў" культработнікі маюць неблагі "прыварак" да плана — чатыры мільёны рублёў. Акрамя таго, сіламі супрацоўнікаў РЦК ладзяцца карпаратывы, канцэрты для прадпрыемстваў, навагоднія і святочныя праграмы, урачыстае правядзенне вяселляў і многія іншыя акцыі: ад "Міс Лельчыцы" да свята Нептуна, што праходзіць на прыватнай аграсядзібе непадалёк ад райцэнтра.

Вынік усёй падобнай эканамічнай дзейнасці — неблагі: за пяць месяцаў установа зарабіла звыш ста мільёнаў. Сродкі пайшлі на набыццё мікрафонаў, абнаўленне светлавой апаратуры, закупку дзіцячых атракцыёнаў — можна цяпер і з прыватнікамі канкурыраваць! — ды выплату прэмій супрацоўнікам.

Гаворка пра заробкі — асобная. Паводле слоў Аляксандра Капыткова, у сярэднім за месяц культработнікі раёна атрымліваюць не так ужо і шмат: усяго два з паловай мільёны рублёў. Прыкладна такую ж зарплату маюць і супрацоўнікі РЦК.

Лельчыцы: платныя паслугі, метады павышэння заробкаў і аптымізацыя

Пра эканамічныя аспекты ў развіцці культуры Лельчыччыны чытайце **на старонках 10 — 11.**

"К" інфармуе

У.Тоўсціх. Трыпціх "Салют Перамогі".

Музей гісторыі вайны: першыя работы для інтэр'ера

Сярод аздобы новага будынка Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны будуць і спецыяльна створаныя для гэтых сцен жывапісныя палотны. У прыватнасці, карціны мусяць упрыгожыць памяшканні побач з залай Перамогі.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Работы былі замоўлены вядомым жывапісцам Уладзіміру Тоўсціку і Уладзіміру Ганчаруку. Днямі наш карэспандэнт меў магчымасць пабачыць завершаныя творы.

Трыпціх народнага мастака Беларусі Уладзіміра Тоўсціка мае назву "Салют Перамогі". Трохчасткавая форма была абрана невыпадкова: яна адпавядае характару архітэктуры. Гэты твор — эмацыянальны аповед пра сённяшні дзень і памяць пра дзень мінулы. На цэнтральным палатне — маладая маці з дзіцем на фоне святочнага салюта. Сярод іншых герояў трыпціха — маладыя людзі і ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Твор сімвалізуе пераемнасць гераічных традыцый і неадольную сілу жыцця.

Карціна Уладзіміра Ганчарука прысвечана 1945 году. Назва — "Вясна Перамогі". Сюжэт — вяртанне пераможцаў дадому. Гістарычная канкрэтыка спалучаецца ў ім з сімвалічнымі вобразамі. Вясна ў дадзеным выпадку — вобраз метафарычны. Гэта і вясна года Перамогі, і знак вечнага абнаўлення нашай зямлі.

Карціны выкананы паводле спецыяльнай тэхналогіі жывапісу па ляўкасе. І хоць выглядаюць яны як станковыя творы, насамрэч з'яўляюцца манументальным жывапісам. Пабачыць іх у інтэр'ерах музея гледачы змогуць 3 ліпеня.

К

У.Ганчарук. "Вясна Перамогі".

Афіцыйна

Любоў да роднага

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельнікаў і гасцей XIV Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі з яго адкрыццём, паведамляе Прэс-служба беларускага Лідара.

"Гэты прадстаўнічы культурны форум з гонарам выконвае пачэсную місію развіцця і папулярызацыі айчыннай літаратуры і музычнага мастацтва, — гаворыцца ў віншаванні. — На сцэнічных пляцоўках Маладзечна выступаюць самыя знакамітыя артысты, аб'яднаныя любоўю да роднага слова і песні. Адной з незабыўных старонак з'яўляецца

Меркаванне

У другой палове 1970-х, калі я вучыўся на дызайнера ў Тэатральна-мастацкім інстытуце, само слова "дызайн" не мела афіцыйнага статуса. З гэтай прычыны ў маім дыпломе пазначана спецыяльнасць "Прамысловае мастацтва" і кваліфікацыя "мастак-канструктар". Рэальнае жыццё, у якое трапляе студэнт, пакінуўшы alma mater, для мастакоў-канструктараў склалася па-рознаму. Але некаторыя з нас сутыкнуліся з тым, што на прадпрыемствах Беларусі, куды мы трапілі па размеркаванні, працы для нас не аказалася. Дакладней, не было працы, якая адпавядала б нашай кваліфікацыі, творчаму імпэту і кар'ерным памкненням. Праз гэта адны, адпрацаваўшы вызначаны тэрмін, змянілі прафесію або — свой статус у рамках прафесіі: падаліся хто на выкладчыцкую працу, хто ў творчасць. Некаторыя з Беларусі з'ехалі. Прычым, далёка. Адзін з маіх аднакурснікаў зараз жыве ў Партугаліі...

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Стаць профі не

Ягоная гісторыя вартая таго, каб на ёй спыніцца. Ад пачатку вучобы аднакурснік быў упэўнены, што жыць будзе не ў гэтай краіне, а дзесьці на Захадзе. Справа ў тым, што падлеткам ён правёў некалькі месяцаў у сваякоў у Швецыі, пасля чаго наша рэчаіснасць падалася прыяцелю шэрай, мякка кажучы. Вучыўся ён добра — без надрыву, але і без асаблівага натхнення. Неаднаразова чуў ад яго: "Я проста стаю ў чарзе па дыплом". Да адмоўных праяў савецкай рэчаіснасці, якія ў студэнцкім асяроддзі былі прадметам гарачых спрэчак, мой аднакурснік ставіўся з іранічным спакоем, нібыта ведаючы, што яго ў перспектыве тое датычыць не будзе. Пры гэтым трэба дадаць, што знаёмы насамрэч таленавіты, здольны на арыгінальныя думкі, меў адметны стыль у малюнку і жывапісе. А яшчэ меў талент на замежныя мовы. Інакш кажучы — "багаж", з якім можна выпраўляцца ў дарогу.

Першым прыпынкам ягонага шляху ў дзіцячую мару стала Югаславія. Потым ён атрымаў від на жыхарства ў Канадзе. І нарэшце атабарыўся ў Партугаліі: ажаніўся з грамадзянкай гэтай краіны, нарадзілася пасля і дачка. З радзімай, аднак, не парываў, і недзе раз на два гады прыязджае ў Мінск. У такіх выпадках паслухаць ягоныя аповеды пра тамтэйшае жыццё збіраўся наш курс. З расказаў вынікала, што жыццё "там" хоць і больш камфортнае, але — не цукар. Праца, адпаведная дыплому дызайнера, выпадала яму не заўсёды. Казаў: "Пра тое, што набліжаецца эканамічны крызіс, у рэкламным бюро, дзе я працаваў, даведваліся раней за ўсіх. Спачатку па скарачэннях, а потым па адсутнасці заказаў..." Давялося майму аднакурсніку падрабляць грузчыкам у лісабонскім аэрапорце, перакладчыкам у судзе (калі за парушэнні законаў затрымліваліся людзі з постсавецкай прасторы), браць выпадковыя заказы. Нават

Што каментуюць чытачы ў Сеціве?

"Змагацца за чытача? Ёсць варыянты!" / № 21

Людміла:

"Цікавы артыкул, згодна са спадарыняй Ганнай цалкам і поўнасцю! Шматгадовы стаж работы ў бібліятэцы, а таксама рэалізацыя асабістых імідж-праектаў, прысвечаных папулярызацыі беларускай дзіцячай і падлеткавай літаратуры на працягу чатырох апошніх гадоў, дае падставу выказаць меркаванне аб тым, што нашай сучаснай дзіцячай літаратуры не хапае піяру! І не толькі з боку бібліятэкараў, але і ад СМІ, асабліва мясцовых, якія любяць надрукаваць нешта бульварнага кшталту, а падзеі, звязаныя з папулярызацыяй беларускай кніжкі для дзяцей займаюць танюсенькую калонку, якую і заўважыць не кожны можа, ды яшчэ і без фота. Слушную думку выказала некалі пісьменніца Алена Масла: трэба з кожнай кнігі рабіць падзею! А ў нас гэта не зусім атрымліваецца. Пра сябе хачу сказаць, што адчуваю вялікае засмучэнне, калі намаганні, накіраваныя на папулярызацыю беларускай кніжкі, не даюць жаданых вынікаў. А калі твае задумкі знаходзяць падтрымку ў калег, кіраўніцтва, чытачоў-дзяцей і іх бацькоў, душа акрыляецца і шукае новых ідэй".

"Аптымізацыя? Які вынік атрымаем?" / № 20

Людміла:

"Няма дакладных арыенціраў дасягнення мэты" — лічу гэтую фразу самай ёмістай і дакладнай у артыкуле спадарыні Алены.

"Усё будзе няшна? Ці — як з катламі?" / № 22

el Rybchinskaja:

"Дзякуй аўтару за артыкул. Як хочацца, каб гэтыя словы, пра якія вы пішаце, былі толькі нечым кішэнным, як у Вашых бацькоў. Спадзяюся, ды і ўпэўнена нават, што наўрад ці яны так стасункаваліся ў школе ці ў інстытуце. А цяпер настаўнікі шукаюць падыход да дзяцей праз слэнг проста на сваіх уроках: у маім выпадку — уроках рускай мовы і літаратуры. Мне складана часам патлумачыць маёй дачцэ, вучаніцы восьмага класа, паводзіны настаўніка. Мы і дома ў сям'і гаворым нармальнымі словамі і нават выпраўляем націскі, як нас у свой час вучылі. Вось вам і распаўсюджанае меркаванне, што выхаванне (а маўленне — гэта акурат выхаванне!) не павінна скідвацца на школу. А хто будзе выхоўваць настаўнікаў? Ну а калі дзіця і выкажа заўвагу настаўніку, што не варта так гаварыць, — дык гэта ўжо дзёрзкасць! Вельмі хочацца, каб і наша школа мела ўмовы экстэрната, хаця б па асобных прадметах, інакш як уберагчы ад слоўнага смецця ўжо нават на ўроках літаратуры?.."

"Рабі што робіш — і будзе што будзе" / № 20

Алесь Петухоў (Шацілкі):

"Сапраўды важную справу робіць сп.Жыгамонт... І яна захапляе гледачоў. Як і прыгаданая студэнтка гістфаку, я сам ад убачаных у школьныя гады "Падарожжаў..." дайшоў да аспіранцтва на гістфаку БДУ. Далейшага плёну і цікавостак на шляху, спадар Юрый!"

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby**

Рэплікі пра...

...расстанне і прэм'еру

Аляксей ДУДАРАЎ, драматург:

— Прэм'ера спектакля "Не пакідай мяне..." па маёй п'есе на Малой сцэне знакамітага Тэатра на Таганцы завяршылася вершам Генадзя Бураўкіна — у арыгінале, на беларускай мове. У свой час радок менавіта з гэтага верша даў назву ўсёй п'есе. І ў Драматычным тэатры Беларускай арміі, дзе гэта п'еса была ўвасоблена ўпершыню, той верш гучыць. Але перанос яго ў маскоўскую пастаноўку, зробленую Юрыем Ардашавым, стаўся для мяне кранальнай, шчымлівай нечаканасцю. Калі ў рускамоўным спектаклі раптам загучала беларуская мова, ды без усялякага акцэнту, гонар узяў за нашу краіну. А радок "Няхай растанне не кране..." нечакана спраецыраваўся на самога паэта, на тое, як зусім нядаўна мы развіталіся з ім назаўсёды. І тут — быццам нейкае пасланне ўсім нам ад яго...

слова і песні

конкурс маладых выканаўцаў, які адкрыў многім майстрам беларускай эстрады шлях на вялікую сцэну".

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цяперашні фестываль прадаўжае свае добрыя традыцыі і пашырае гарызонты, каб нагадаць нам лепшыя старонкі музычнай спадчыны і адкрыць новыя імёны сучасных кампазітараў, паэтаў і спевакоў. Яго разнастайная праграма, прысвечаная 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 45-годдзю легендарнага ансамбля "Песняры", стане яшчэ адным важкім укладам у патрыятычнае выхаванне грамадзян і ўмацаванне духоўнага адзінства народа.

тут, але... знайсціся там

вучыць дзяцей маляванню даводзілася. А зараз ён па Лісабоне экскурсіі водзіць. Звычайнае эміграцкае жыццё...

Цікава, аднак, вось што… У ягоныя першыя прыезды адчувалася, што ён прадстаўнік іншага свету — больш уладкаванага, больш утульнага і зручнага. Аднакурснік распавядаў, на якім камп'ютары працуе, якой праграмай карыстаецца, калі робіць той ці іншы праект, як адпачывае на экзатычных выспах і як выглядае заход сонца ў Венецыі.

Але з часам і іншыя мае аднакурснікі прыдбалі не горшыя камп'ютары з такімі ж эфектыўнымі праграмамі, выйшлі на заказы значна больш прэстыжныя, чым тыя, што ён мае ў Партугаліі, дасягнулі поспеху ў выдавецкім бізнесе, сталі выкладчыкамі вышэйшай школы. Да прыкладу, менавіта мае аднакурсніцы рабілі сучасныя знакі-лагатыпы Беларускай чыгункі і кінастудыі "Беларусьфільм", графічны стыль віцебскага "Славянскага базару" і тамтэйшага ж Шагалаўскага пленэра. Ды і вандроўкі ў далёкае замежжа сталі для грамадзян суверэннай Беларусі звыклай справай. Прыехаўшы ў Мінск сёлета, партугальскі беларус адзначаў, што ў нашых крамах тыя ж тавары, тыя ж сусветныя брэнды, што і ў іншых еўрапейскіх сталіцах. Прычым, уражвае іх шырокі асартымент.

На пачатку 1990-х яму прыходзіла думка вярнуцца. Але, паводле ягонага аповеду, айчына сустрэла дызайнера не надта ветліва. Уладальнік савецкага пашпарта з мінскай прапіскай мусіў атрымаць грамадзянства Рэспублікі Беларусь аўтаматычна. Але абставіны, у тым ліку бюракратычнага плану з боку адпаведных інстанцый, перашкодзілі працэсу…

Мяркую, па-сапраўднаму адаптавацца да іншага свету ён так і не здолеў. Развёўся з жонкай-партугалкай, ажаніўся з расіянкай, што, як і ён, стала жыве ў Партугаліі. Ягоны асяродак там — выхадцы з былога СССР. Сумоўе ж складаецца з успамінаў і абмеркаванняў падзей на колішняй радзіме. Мой прыяцель кажа, што апошнія падзеі на постсавецкай прасторы ўнеслі разлад у рускамоўную супольнасць, якая раней трымалася разам.

Я падрабязна распавядаю пра аднакурсніка, бо мяркую, што ягоны лёс у чымсьці тыповы для эмігранта. Ягонае жыццё нагадвае мне сюжэт фільма Антаніёні "Прафесія: рэпарцёр", герой якога спрабуе збегчы ад самога сябе, ад сваёй накаванасці… Хто глядзеў той фільм, разумее пра што я кажу. Мне здаецца, што прыяцель калі-небудзь усё ж вернецца на радзіму. І ягоны досвед не аднаго дзесяцігоддзя знаходжання ў іншым свеце будзе карысны для Беларусі. Нядаўна адобраны Саветам Рэспублікі Закон "Аб беларусах замежжа" дае яму і такім, як ён, шанц пазбавіцца адчужанасці, адчуць сябе патрэбнымі на той зямлі, дзе яны нарадзіліся, пры гэтым застаючыся і грамадзянамі іх цяперашняй краіны пражывання.

Фотасюжэт нумара

У пятніцу распачаліся мерапрыемствы XVII Міжнароднага фестывалю народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік". Паставы чарговы раз напоўніліся святам шчаслівых творчых зносін. А ў суботу, 14 чэрвеня, з гэтай нагоды адкрываецца філіял Пастаўскага раённага краязнаўчага музея ў палацы Тызенгаўза.

Яўген РАГІН

Паставы: першая чарга музея

Ён створаны ў выніку рэалізацыі праекта "Заахвочванне турызму абапал мяжы Літвы і Беларусі з мэтай павышэння даступнасці і прыцягальнасці культурна-гістарычнай спадчыны ў Рокішскім і Пастаўскім раёнах" Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія — Літва — Беларусь, што рэалізуецца ў рамках Еўрапейскага інструмента добрасуседства і партнёрства.

Як паведамляе дырэктар музея Раіса Курачэнка, праект рэалізоўваўся амаль два гады. Агульны бюджэт перавысіў 650 тысяч еўра. Рэканструяваны былі падвальныя памяшканні палаца. Тут створаны музейныя экспазіцыі, што адлюстроўваюць унікальныя старонкі гарадской гісторыі і распавядаюць пра графа Канстанціна Тызенгаўза, вучонага і мецэната.

Фота інтэр'ераў прадастаўлена музеем, здымкі палаца і парка — Пятра КУРЫЛОВІЧА

Пра адметнасці сёлетняга фэсту "Звіняць цымбалы і гармонік" чытайце **ў наступных нумарах "К".**

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура"
звяртайцеся па тэлефоне
+ 375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41,
альбо на электронны адрас
kultura@tut.by!

...гістарычнае кіно

Зміцер ЮРКЕВІЧ, арт-куратар:

— З адносна нядаўніх часоў у СМІ зноў усё часцей сустракаем паняцце "нацыянальная ідэя". Аўтары пытанне ставяць, але самі на яго не адказваюць. На мой погляд, тое адзінае для ўсіх, апроч тэрыторыі пражывання, — гісторыя краіны. Гэта грунт, база, глеба. Бо яна фарміруе адносіны да зямлі, да памяці продкаў, да гісторыка-культурнай спадчыны.

Нашы суседзі добра разумеюць вартасць гісторыі. Сведка таму — кінематограф. Напрыклад, польскі. Хоць і экранізавалі там у асноўным творчасць ураджэнцаў, выхадцаў альбо гадаванцаў беларускай зямлі — Міцкевіча, Крашэўскага ды Сянкевіча. Урэшце, кіно нашых суседзяў сваю справу выканала: палякам (і не толькі) вядомыя Пан Валадыеўскі, Заглоба, Гервасій ды "здраднік "Януш Радзівіл… У савецкі час шмат здымалі і пра рускую гісторыю: "Дзяцінства Пятра", "Расія маладая", стужкі пра Ламаносава, Суворава, Неўскага… Актыўна развіваюць гэтую плынь і ў нашы часы, напрыклад, праз фільмы "1612" (стужка, якая многім запомніцца скураной гарматай, з якой маскавіты знішчылі ледзь не усё варожае войска) і "1814".

Любы нацыянальны кінематограф мае шэраг моцных стужак, якія запаўняюць тысячагадовы вакуум і адным махам ткуць гістарычнае палатно ў свядомасці. Пасля прагляду разумееш, маўляў, і мы не лапцем шчы хлябалі. А галоўнае, сусед становіцца бліжэй, бо, аказваецца, мы ледзь не сваякі і стагоддзямі разам паўставалі супраць злыбяды. То бок, агульнага ў нас столькі, што і падзяліцца не грэх.

А у нас? Спрабую нешта прыгадаць — і не магу. "Паром", "На Чорных лядах" — гэта з таго, што найбольш уразіла. "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Я — Францыск Скарына…", "Купальская ноч"? Але ўсё гэта нельга параўноўваць з "Агнём і мячом" ці "Патопам"… На жаль, стужкі пра долю-нядолю беларускага вяскоўца таксама не выклікаюць нейкага гонару за героя.

Я пра тое, што нам патрэбны, як паветра, якасныя , поўныя драматызму, гераізму творы, якія маглі б троху пасунуць на паліцах здабыткі сусветнага кіно, розных "жалезных чалавекаў"… Не магу ў звязку са сказаным не закрануць адну з наймагутных постацей нашай гісторыі. Гаворка пра Тадэвуша Рэйтана. Сталыя чытачы "Культуры" сустракаюць гэтае імя часта, і ім няма патрэбы тлумачыць, кім ён ёсць у нашай гісторыі. Экранізаваўшы ягоны лёс ад дзяцінства праз падзеі на сойме 1773 г. да трагічнай смерці, можна не толькі "закрыць" на экране амаль усё XVIII стагоддзе, паказаўшы складанасці сітуацыі, у якой апынулася Вялікае Княства Літоўскае, але і распавесці пра тое, што такое мужнасць, грамадзянскі абавязак з аднаго боку і здрада ды падступства з іншага. Урэшце, шмат якія асобы — у чаканні на кіналёс: Леў Сапега, Ян Караль Хадкевіч і спіс той можна доўжыць…

Акурат тады, стаўшы на такі грунт, куды прасцей каваць стрыжань нацыянальнай ідэі. А пакуль… На нашых экранах гаспадараць замежныя героі...

Дзяжурны па нумары

“Адышла. Хутка буду”.

Яўген РАГІН,
рэдактар аддзела газеты “Культура”

Змушаны даваць пэўным чытачам пэўныя тлумачэнні. Прычына простая: хочацца спыніць урэшце недарэчныя, як падаецца, тэлефанаванні, якія выкліканы нашымі з Кастусём Антановічам публікацыямі паводле нашых жа аўтавандровак па гарадах і вёсках Беларусі. Гэта ўжо ці не завядзёнкай стала: недзе ў аўторак, калі наш свежы нумар дайшоў ужо да ўсіх без выключэння падпісчыкаў, у маім кабінеце шалее тэлефон. Абураныя грамадзяне катэгарычна не пагаджаюцца з нашымі крытычнымі заўвагамі — наконт парушэння працоўнай дысцыпліны ў той ці іншай сельскай установе культуры. Вось па гэтай прычыне і дазволю сабе выказацца, каб хоць над большасцю “і” расставіць тлустыя кропкі.

Але найперш — пра сутнасць справы. Прыязджаем мы, скажам, да сельскага клуба. Па графіку, што вісіць ля ўвахода, установа павінна працаваць. Але дзверы — зачыненыя. Прыблізна ў трох выпадках з пяці адсутнасць работніка хоць нейкім чынам тлумачыцца адпаведнай абвесткай, складзенай самім работнікам. Змест напісанага ад рукі на аркушыку з вучнёўскага сшытка — нескладаны: “Хутка буду”, “Адышла ненадоўга”, “Адпрасілася”, “Буду праз паўгадзіны”… Пры гэтым збольшага няма ні подпісу, ні даты, ні тым больш часу адыходу. Вось і чухаеш сівую журналісцкую патыліцу: “У каго яны адпрошваліся, калі, куды і з якой нагоды?”. І, паверце, з кожнай камандзіроўкі мы прывозім процьму вось такіх “абвестачных” перлаў.

Толькі адзін прыклад: у СДК аднаго з раёнаў падышлі спачатку да бібліятэкі. Абед тут скончыўся, але аркушык паведамляў: “Адышла ненадоўга ў касу”. Кастусь, больш разважлівы і менш эмацыйны, заўважыў: “А што, справа жыцейская!” Я пагадзіўся і мы пайшлі ў клуб. Той працаваў як мае быць, у зале — спявалі і танчылі, а мы з кіраўніцай пілі каву і размаўлялі пра надзённае. Кавай той ці не абпіліся, а бібліятэка ўсё заставалася зачыненай. Антановіч, добрая душа, параіў сам сабе, каб "зніклыя" ў такіх нерэгламентных выпадках пакідалі на абвестцы нумар свайго мабільнага. Парада, як я думаю, — досыць слушная. Хоць звязацца можна ды высветліць, а раптам, сапраўды, што (цьфу, цьфу, цьфу!) здарылася. Усё астатняе, за выключэннем такіх, жыццёвых, сітуацый, — грубае парушэнне працоўнай дысцыпліны работніка дзяржустановы. Аксіёма, не вартая доказаў.

Я доўга спрачаўся па тэлефоне са старшынёй аднаго з сельсаветаў. Ён даводзіў, што бібліятэка не працавала, бо ў яе супрацоўнікаў — законны санітарны дзень, а на працы яны не былі, бо прыбіралі зону адпачынку ў зусім іншым месцы. Я нічога не меў супраць планавых прыборак, непакоіла іншае: адпаведныя абвесткі на дзвярах клуба і бібліятэкі адсутнічалі.

Тое ж тычыцца не толькі клубаў, але і бібліятэк. У адным выпадку, як мы перакананы, прычыну адсутнасці бібліятэкара на рабочым месцы можна лічыць уважлівай: калі ён наведвае чытачоў на даму. Але абвесткі такія — досыць рэдкія. Я доўга спрачаўся па тэлефоне са старшынёй аднаго з сельсаветаў. Ён даводзіў, што бібліятэка не працавала, бо ў яе супрацоўнікаў — законны санітарны дзень, а на працы яны не былі, бо прыбіралі зону адпачынку ў зусім іншым месцы. Я нічога не меў супраць планавых прыборак, непакоіла іншае: адпаведныя абвесткі на дзвярах клуба і бібліятэкі адсутнічалі. І на нашых вачах у бібліятэку прыязджала на ровары чытачка. Як прыехала, так і з’ехала, памянуўшы нядобрым словам усю сістэму культуры. І вось так мы змагаемся за кожнага чытача? Але старшыня сельсавета застаўся пры сваім меркаванні. А што было б, калі б “К” выйшла з пустымі палосамі, а праз тыдзень мы сарамліва паведамілі б чытачам: “Даруйце, у нас санітарны дзень быў, забыліся пра яго абвясціць”?

У большасці ж выпадкаў зачыненыя ў рабочы час установы ўвогуле не маюць абвестак. Дзе гаспадары? З каларадскімі жукамі змагаюцца, загараюць, рыбу ловяць, спяць у скошанай траве? Гэта ж не праца — рай! Прыклады “беспадстаўнай зачыненасці” прывозім ці не з кожнай камандзіроўкі. Абавязкова публікуем іх. І наша логіка пры гэтым нескладаная: калі бібліятэка ці клуб не працуюць у рабочы час, значыць кіраўнікі ўпэўненыя, што ў іх паслугах вяскоўцы не маюць патрэбы. Між тым, на журналісцкай практыцы пераконваемся ў адваротным: чытачы і гледачы ва ўстановы ідуць, але сустракаюць іх зачыненыя без дай прычыны дзверы. Напэўна, дзесьці гэта ўжо непісанай нормай лічыцца? Таму ананімныя дакучлівыя тэлефанаванні наконт таго, што час ад часу памянёныя намі ўстановы ўсё ж адчыняюцца і радуюць насельніцтва выключна цікавымі мерапрыемствамі, мы ўспрымаем з пэўнай доляй скептыцызму. Ці не ладзяцца яны на даму і для вузкага кола? Не, тыя мерапрыемствы мо і суперскія. Але ці можа чалавек прэтэндаваць на званне адказнага прафесіянала, калі на рабочым месцы яго не заспець?

К

Форум

Мы пастаянна задаём бібліятэкарам пытанне: ці трэба перафармаціраваць вашу справу? Амаль кожны стараецца ўхіліцца ад адказу. Між тым, пытанні “Як не згубіць чытача?”, “Як прыцягнуць новага?”, “Як увогуле захаваць ад працэсаў аптымізацыі сельскую бібліятэку?” з кожным днём набываюць усё большую актуальнасць. У Расіі, да прыкладу, гавораць пра гэта на поўны голас. У нас — трымаецца незразумелая паўза. Не спазніцца б. Таму мы, журналісты “К”, тыя, хто стала працуе з тэмай установаў культуры і, у прыватнасці, бібліятэк, вырашылі абмеркаваць перспектывы бібліятэчнай справы спачатку на сваім, журналісцкім, узроўні. А раптам нашы развагі зачэпяць ды раскатурхаюць прафесіяналаў? Мы вельмі гэтага хочам і чакаем контраргументаў і контрпрапаноў.

Тры меркаванні пра заўтра адной установы

А бібліятэка будучыні вам не патрэбная?

Спачатку прэамбула. Колішні аднакласнік нядаўна запытаўся: “Ну, і што далі табе твае кніжкі?” Я абразіўся: “Ды ўсё, што маю сёння за душой!” Жыву сярод кніг. Сваіх і чужых. Як дорага яны дастаюцца… Гадоў трыццаць таму дзяды-газетчыкі прымусова прадалі мне сямідзесяцікапеечныя “Жанры савецкай газеты” за тры з даважкам рублі. (І для чаго ім спатрэбілася менавіта гэтая сума?) Я тады ўпершыню задумаўся пра марнасць суб’ектыўнай ацэнкі кніжнага кошту. Пэўны баланс у дадзеным кірунку ўсталяваў для сябе толькі тады, калі ля сталічнага Чэрвеньскага рынку прыдбаў у нейкага дзядзькі двухтомнік Жванецкага за сорак тысяч рублёў. А колькі кніг у мяне скралі! Малдаўскія казкі, апавяданні і раманы Чапека і Твена, паморскія аповесці Бадзігіна! Апошняя страта — выданне запісных кніжак Даўлатава. Хто браў? Аддайце!..

Яўген РАГІН

Як унармаваць гэты бясконцы кнігазварот, што паддаецца абсалютна невядомым прыродным законам? Па маім цвёрдым перакананні, зрабіць гэта павінна бібліятэка. Універсальная і аўтарская. Спынімся на апошнім азначэнні. Памятаеце фільм Герасімава “Ля возера”, дзе гераіня Белахвосцікавай аддала дзяржаве сямейную бібліятэку і стала працаваць у ёй бібліятэкарам? Кнігі збіраліся некалькімі пакаленнямі, таму гераіня стужкі ведала не толькі месцазнаходжанне кожнай на паліцах, але і пра ўнутрысямейны лёс любога выдання. Уяўляеце, якой прафесійнай была гаворка з чытачом! Такую ўстанову і варта называць аўтарскай. Усе бібліятэчныя працэсы адсочвае асоба з напрацаваным талентам беспамылковага лоцмана ў бясконцым кніжным моры. Прыклад аўтарскай бібліятэкі — рыжская ўстанова сатырыка Міхаіла Задорнава, пра якую мы згадвалі шмат разоў.

А цяпер зоймемся класіфікацыяй бібліятэк (найперш — раённых ды сельскіх), што, на маю думку, павінны стаць у самай недалёкай будучыні не толькі надзейнай “пасткай” для сталых кнігалюбаў, але і гарантаванай прынадай для тых, хто яшчэ не трапіў у палон чытання. Дык вось…

Бібліятэка-кнігарня. На абанеменце выбіраем, у букіністыцы — купляем. Можна абмяняць уласны непатрэбны том на штосьці больш цікавае. У маладосці, калі праўдамі і няпраўдамі збіраў дэфіцытныя выданні, заўжды купляў двайныя экзэмпляры ўлюбёнай фантастыкі (балазе ўсе прадаўшчыцы веткаўскай кнігарні былі добрымі знаёмымі), што давала магчымасць выменьваць кнігі і ў збіральнікаў-канкурэнтаў. Пэўную колькасць дубляў захаваў і па сёння, вось для такіх, напэўна, бібліятэк-кнігарняў… Аўтарская бібліятэка прадугледжвае абарачэнне абанементных кніг з аўтографамі іх аўтараў. Па гэтыя аўтографы не грэх скіравацца ў Мінск, Маскву, Пецярбург. Дарэчы, мае знаёмыя сталічныя бібліятэкары так і робяць. І толькі не трэба мне казаць, што для продажу ды абмену кніг у бібліятэчных умовах патрэбны дазволы, ліцэнзіі і адпаведная прававая база. Вось прыватнік, ён усяго даб’ецца. А бібліятэкар-дзяржаўнік?.. Няўжо будучыня — за прыватным кніжным капіталам?!

Бібліятэка-(кіна)тэатр. Як прывабіць да кніжных паліц маладзёнаў? Сцэнай ці экранам, што размесцяцца ля гэтых самых паліц. Ад двойкі па літаратуры мяне выратаваў нядзельны тэлепаказ “Злачынства і пакарання”. З-за гуляў не паспяваў справіцца з Дастаеўскім. А тут — бліскучы Тараторкін у ролі Раскольнікава. У панядзелак — пяць балаў у дзённік! Гэта потым ужо прыйшла, не, не любоў, а проста павага да Дастаеўскага… Ці не такім чынам, паступова, крок за крокам, трэба браць у кніжны палон падрастаючае пакаленне? Спачатку паказваць лепшыя экранізацыі ці сцэнічныя пераставрэнні (сіламі чытацкага актыву), а потым і выданні пад руку падсоўваць. Не сакрэт, што пасля экранізацыі "Майстра і Маргарыты" кніжкі гэтыя зніклі з бібліятэчных паліц… Так, клопату бібліятэкарам дадасца. Але ж не баяцца яго, да прыкладу, у Асіповіцкім раёне, дзе літаратурныя тэатралізацыі сталі нормай.

Бібліятэка-музей. Абанементцкая і чытальная залы пераўтвараюцца яшчэ і ў музейныя экспазіцыі, дзе сабрана ўсё, што датычыцца Кнігі. Злавіў сябе на думцы, што больш чым за сорак гадоў чытацкай дзейнасці ніколі не звяртаў увагі на кніжныя выстаўкі (калі яны не тычыліся навінак). Дык мо сапраўды іх час адышоў у нябыт? Якія экспанаты бачацца? Аўдыявідэазапісы пісьменніцкіх выказванняў і меркаванняў. Дзе іх браць, глядзі вышэй. Рукапісы і фотаздымкі. Давайце шанаваць літаратараў не толькі пасля іх смерці. А пры такім шанаванні яны да вас і прыедуць, і мора падарункаў пакінуць, сярод якіх будуць і кніжкі з аўтографамі.

Усё, што маю за душой...

Працяг абмеркавання тэмы будучыні бібліятэк у бачанні журналістаў газеты "Культура" **чытайце на старонцы 7.**

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77,
альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце на
facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby

“Кропка адліку”

Антон СІДАРЭНКА,
кінакрытык

2014-ты для нацыянальнага кінамастацтва — юбілейны: дзевяносты. Шчыра скажам, не хацелася б, каб у гэты год усё абмежавалася толькі ўрачыстым пасяджэннем у Дзень беларускага кіно 17 снежня і стандартным узнагароджаннем работнікаў кінагаліны. Так, пагаджуся, момант для айчыннага кінамастацтва зараз несвяточны. Прамежкавы. “Беларусьфільм” набывае новае аблічча, а айчынныя кінематаграфісты пакуль выношваюць планы ператварэння яго ў Нью-Галівуд. І, у адсутнасці сучасных шэдэўраў, кіназнаўцы звярнуліся да багатай спадчыны нашага кіно.

Ідэя скласці рэйтынг самых удалых фільмаў — не новая. Спісы касавых стужак публікуюцца ці не з часоў Луіса Маера. А пачынаючы са 100-годдзя кіно ў 1995-м, з’явілася перманентная мода на складанне разнастайных спісаў “лепшых фільмаў усіх часоў і народаў”.

Калі некалькі месяцаў таму на пасяджэнні Праўлення Беларускага саюза кінематаграфістаў вырашалі, якім чынам адзначыць 90-годдзе нашага кіно, кіназнаўца Ала Бабкова і рэдактар Ізольда Кавелашвілі выказалі ініцыятыву стварыць рэйтынгавы спіс беларускіх карцін, пачынаючы з 1925-га. Вызначыць спісы “самых-самых” ігравых, тэлевізійных, дакументальных, анімацыйных і відэастужкак, у тым ліку так званых незалежных студый, вырашылі даверыць дваццаці чатыром тэарэтыкам. Некалькі тыдняў супрацоўнікі аддзела экранных мастацтваў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук, Інстытута журналістыкі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, прадстаўнікі СМІ (кінааналітыкі, кіна- і тэлежурналісты), а таксама адзін дзеючы рэдактар кінастудыі “Беларусьфільм” і двое яго калег “у адстаўцы” займаліся ранжырамі.

Ад экспертаў патрабавалася назваць і расставіць такім чынам па 20 назваў у кожнай з катэгорый (у анімацыі — 10 назваў), пасля чаго спісы былі апрацаваны і зведзены ў адзіны. З падрабязным варыянтам рэйтынгу можна будзе азнаёміцца праз два месяцы ў часопісе “Мастацтва”. Пакуль жа скажу, што ніякіх сюрпрызаў не здарылася. Эксперты былі практычна адзінадушныя, іхнія ацэнкі кардынальна не адрозніваліся. Больш за тое: меркаванне спецыялістаў, у прынцыпе, адпавядае даным розных апытанняў і галасаванняў сярод шырокай публікі. Не раскрываючы ўсе карты, адзначу, што сярод лідараў, прадказальна, — фільмы Леаніда Нячаева, Віктара Турава, Міхаіла Пташука, Валерыя Рубінчыка. Шэдэўры Элема Клімава “Ідзі і глядзі” і Валерыя Рыбарава “Чужая Бацькаўшчына” радзей згадваюцца шараговымі гледачамі, затое ў топе ў спецыялістаў. У дваццатцы самых рэйтынгавых ігравых у экспертаў, і гэта таксама паказальна, толькі два фільмы з лэйблам Нацыянальнай кінастудыі, што былі створаны за апошнія дваццаць гадоў: “У жніўні 44-га…” Міхаіла Пташука і “Ваўкі” Аляксандра Колбышава.

Зрэшты, часавыя рамкі “залатой эры” нашага ігравога кіно лёгка было вызначыць з самага пачатку. Самае галоўнае на “Беларусьфільме” адбывалася ў 1960 — 80-я мінулага стагоддзя і звязана з некалькімі дзясяткамі яркіх імёнаў, з якімі студыі відавочна пашанцавала.

Калі з ігравымі ды тэлевізійнымі карцінамі (у разрадзе Беларускага тэлебачання тут дамінуюць цудоўныя спектаклі — серыялы “Людзі на балоце”, “Уся каралеўская раць”, “Атланты і карыятыды”) усё было больш-менш зразумела з самага пачатку, то дакументальны і анімацыйны рэйтынг утрымліваў інтрыгу. Зразумела, у выніку ў ім, натуральна, знайшлося годнае месца і для гістарычнай публіцыстыкі Віктара Дашука ды Святланы Алексіевіч, Аркадзя Рудэрмана, і для пранікнёнага падыходу Міхаіла Жданоўскага, і для незямной адасобленасці Віктара Аслюка. А ў рэйтынгу анімацыі ганаровыя месцы занялі рукатворныя шэдэўры сучаснага пакалення беларускай анімацыі, якая цяпер знаходзіцца ў самым росквіце: карціны Алены і Уладзіміра Пяткевічаў, Ігара Волчака, Ірыны Кадзюковай, Міхаіла Тумелі, Аляксандра Ленкіна.

Зразумела, сама ідэя рэйтынгу “лепшых” фільмаў можа і падацца густаўшчынай: тое або іншае занятае карцінай месца часам залежыць ад рашэння і настрою эксперта. Дый як можна параўноўваць нямыя, чорна-белыя стужкі дваццатых гадоў мінулага стагоддзя з фільмамі з камп’ютарнымі спецэфектамі 2010-х?.. Памятаецца, маскоўскі часопіс “Искусство кино” ў юбілейным нумары, прысвечаным 100-годдзю дзясятай музы, разбіў свой рэйтынг па дзесяцігоддзях, зрабіўшы яго такім чынам больш лагічным. Цяперашні ж беларускі рэйтынг не робіць адрозненняў паміж эпохамі ды ўмовамі, у якіх здымаліся стужкі. Але сваю справу, спадзяёмся, ён усё ж такі зробіць.

Напрыклад, ён паслужыць метадычным матэрыялам для складальнікаў кінапраграм і тых, хто будзе вывучаць гісторыю нашага кіно. А пачаць можна з бліжэйшага Мінскага міжнароднага кінафестывалю “Лістапад”, які, несумненна, не зможа абмінуць увагай знамянальную дату.

Урэшце, няхай рэйтынг лепшых беларускіх фільмаў будзе чымсьці накшталт своеасаблівай кропкі адліку, якая вызначыць пачатак беларускага экраннага мастацтва XXI стагоддзя. Тым больш, новае кіно адрозніваецца ад таго, якое здымалі яшчэ 10 — 15 гадоў таму, прыкладна як “Лясная быль” Юрыя Тарыча — ад “Настассі Слуцкай” Юрыя Ялхова. Спадзяёмся, неўзабаве мы знойдзем нагоду не толькі азірнуцца ў слаўнае мінулае ды спадзявацца на яскравую будучыню, але і парадуемся ўдаламу цяперашняму…

К

Крытык пра крытыку: па-філасофску

Вадзім САЛЕЕЎ,
доктар філасофскіх навук,
прафесар

Боль мой — пра навуку і мастацтва. Сёння так склалася, што на адным баку засталася сухая навука пра мастацтва, на другім — рэклама тых або іншых яго з’яў. А крытыка, маўляў, зжыла сябе. Але так не павінна быць! Грамадству патрэбны і гламурныя выданні, і навуковыя, як з вузкім колам аўтараў, так і з шырокім. Я заўсёды марыў, каб у Беларусі быў сур’ёзны, элітарны часопіс пра мастацтва, адпаведны патрабаванням Вышэйшай атэстацыйнай камісіі (ВАК), дзякуючы чаму там маглі б з’яўляцца найноўшыя навуковыя распрацоўкі, а мастацкая крытыка была б на найвышэйшым узроўні і дапаўняла б навуку.

У свой час, будучы галоўным рэдактарам часопіса “Мастацтва”, я зрабіў яго ВАКаўскім, але гэта не атрымала працягу. Цяпер імкнуся зрабіць ВАКаўскім новы часопіс — навукова-метадычны “Артэфакт”, які з бягучага года выдаецца Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў, дзе я апошнім часам выкладаю. У ім на роўных друкуюцца і навуковыя даследаванні, і сур’ёзныя крытычныя артыкулы, прысвечаныя ўсім відам мастацтва. Чаму я так клапачуся пра якасную крытыку? Каб яна супрацьстаяла агрэсіі масавай культуры, па большай частцы не нашага паходжання, якая разбурае нацыянальны падмурак і духоўныя асновы нашай культуры.

Шмат ужо гаварылася пра тое, што на сёння мы — адзіная краіна ў СНД, дзе з навучальнага працэсу выключана такая дысцыпліна, як “Сусветная мастацкая культура”. Вядома, механічнае вяртанне гэтага прадмета ў школу — зусім не панацэя ад усіх бед. Але нават само па сабе дакрананне да сусветных мастацкіх каштоўнасцей можа пакінуць вялікі след у душы падлетка. Усё ўбачанае і пачутае абавязкова будзе ім асэнсавана — няхай і праз час. І прынясе ў далейшым свой плён.

Апошнім часам я займаюся так званай неаксіялогіяй, выпрацоўваю новы погляд на сістэму каштоўнасцей, якая шмат у чым фарміруе сэнс жыцця чалавека. З гэтай тэмай я выступаў на некалькіх міжнародных канферэнцыях, на Сусветным кангрэсе ў Кракаве. Сутнасць маёй дактрыны наступная. З аднаго боку, існуе аб’ект — гэта ўласна каштоўнасці. З іншага — суб’ект, які з’яўляецца носьбітам ацэнкі той або іншай каштоўнасці. Паміж гэтымі двума полюсамі — аксіялагічнае поле. А цэнтр прыцягнення ўвесь час хістаецца з аднаго боку ў другі, змяшчаючыся то да каштоўнасцей, то да іх ацэнак. Уяўляеце, што адбываецца? Ацэнка набывае такое ж значэнне, як і сама каштоўнасць. А калі гэтая ацэнка няправільная? Мару напісаць пра гэта кнігу.

Увогуле, нам сёння вельмі не хапае глыбокага філасофскага асэнсавання многіх і многіх сучасных з’яў. Пайшлі з жыцця тры вядучыя філосафы, дактары навук: Уладзімір Конан, Мікалай Крукоўскі, Юрый Гусеў. З’ехала ў Маскву Арыядна Ладыгіна. Адсутнасць гэтых буйных фігур айчыннай навукі адчуваецца вельмі востра. Хто прыйдзе на іх месца? Моладзь, як я заўважаю, у навуку не надта імкнецца, бо, у рэшце рэшт, у многіх пераважвае прагматызм, спажывецкае стаўленне да жыцця. У мяне шмат вучняў — не толькі ў Мінску, але і ў Вільнюсе, Гамбургу, Мазыры, Маскве, Чарнігаве. Іншыя, як кажуць, на руках носяць, а хтосьці — на дух не пераносіць, бо я разбураю іх утульнае “балотнае” існаванне. Люблю тых, хто нясе з сабой творчы падыход, крэатыўнасць, цаню ў людзях прафесіяналізм ды чалавечнасць. І веру, што праз такую моладзь у нас усё ж здарыцца карэнны пералом у стаўленні да культуры ва ўсіх яе складніках…

На тым сяброўства грунтавалася…

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ,
паэт, дырэктар Дырэкцыі
замежнага вяшчання
Беларускага радыё

Значным падмуркам для майго станаўлення як беларускамоўнага чалавека сталася знаёмства і сяброўства з журналістамі Іванам Стадольнікам ды Германам Кірылавым. З імі я працаваў у полацкай газеце “Сцяг камунізму”, куды на пасаду карэктара мяне, рабочага завода шкловалакна, паклікаў колішні рэдактар Іван Фёдаравіч Лемеш.

Абодва потым стануць пісьменнікамі, але ў той час мяне вабіла, што Іван і Герман гаварылі на выдатнай беларускай мове. Дзякуючы ім я пазнаёміўся з сынам вядомага садавода Івана Сікоры з вёскі Алашкі Шаркаўшчынскага раён Віктарам Іванавічам, які ў свой час нават пацярпеў за сваю беларускасць. Тады на радзіму вярталіся многія былыя навучэнцы Глыбоцкага педвучылішча, што правялі лепшыя маладыя гады ў ГУЛАГу за імкненне да беларускага слова… Іх, маладых, гарачых, нявопытных, абвінавацілі ў антысавецкай дзейнасці, стварэнні падпольнай арганізацыі і прысудзілі вялікія тэрміны. Потым многія з іх стануць героямі дакументальнай кнігі Германа Кірылава “Гарт”…

І калі я паказаў Івану і Герману свае беларускамоўныя вершы, абодва выказалі меркаванне, што яны больш натуральныя і глыбокія, чым мае юначыя радкі па-руску, што, у адрозненне ад маіх рускамоўных вершаў, у іх няма пераймальніцтва і надуманасці.

Затым была цэлая эпоха, звязаная з літаб’яднаннем “Крыніцы” пры наваполацкай газеце “Хімік”, пасля майго пераезду ў гэты малады горад. Я мог бы назваць больш за дзясятак вядомых беларускіх літаратараў, якія тады складалі касцяк літаб’яднання. Але галоўнае — тое, што наша колішняе сяброўства грунтавалася не толькі на агульных літаратурных справах. Гэта — першыя сумесныя ўрокі глыбокага патрыятызму, агульнай любові да беларускага слова.

Аднойчы на адным з абласных семінараў творчай моладзі адзін з мясцовых чыноўнікаў з’едліва спытаўся, на якой мове мы размаўляем дома, і сустрэў у адказ дружны рогат, бо на той час беларуская мова ў кожнага з нас была менавіта мовай зносін у сям’і, на працы, у стасунках з іншымі людзьмі.

У тыя гады дзякуючы нашым намаганням упершыню ў адной са школ горада адкрыўся першы беларускамоўны клас. Сёння ўжо дзеці многіх маіх колішніх сяброў — дарослыя людзі (музыканты, мастакі, журналісты, настаўнікі, інжынеры, нават ёсць святар) — працягваюць тое, што было закладзена ў іх з дзяцінства: гавораць і думаюць па-беларуску, спрыяюць функцыянаванню беларускага слова. І што самае істотнае — беларуская мова нікому не перашкодзіла выдатна валодаць рускай, а некаторым — і іншымі мовамі, стаць рознабакова адукаванымі сучаснымі людьмі.

Прыемна, што ў штодзённых стасунках да мовы сталі ўсё часцей звяртацца не толькі маладыя людзі, якія цікавіліся літаратурай. Па-беларуску загаварылі рок-музыканты, нават некаторыя чыноўнікі, скажам, колішні загадчык гарадскога аддзела культуры Людміла Касьянава, дачка вайскоўца, што прыехала з Расіі. Прычым ніхто нікога не прымушаў гаварыць так: людзі самі паступова ўключаліся ў працэс.

Той наваполацкі досвед, я нярэдка згадваю цяпер, бо нешта падобнае бачу вакол, там, дзе ствараецца асяроддзе, там, дзе не гучнымі лозунгамі, а простай штодзённай атмасферай прывіваецца любоў ды прыхільнасць да мовы народа, бо, як сказаў нядаўна ў сваім штогадовым Пасланні Кіраўнік дзяржавы, калі забудзем беларускую мову, перастанем быць нацыяй…

Асацыяцыі з Магілёвам

Забелаў з жыліцкай дынастыі: пайсці "ў метал", знайсці "не мэтал"

Маладога музыканта і кампазітара Ягора ЗАБЕЛАВА бывае цяжка заспець не толькі на роднай Магілёўшчыне, куды ён, па ўласных словах, завітвае нячаста, але і ў Мінску. Днямі ён выправіўся на фестываль у Люблін, дзе будзе іграць (вядома, на баяне) з польскім рок-гуртом. Выступіць у Лодзі з вулічнымі тэатрамі. Разам з акцёрам Дзмітрыем Рачкоўскім рушыць на Міжнародны фестываль лялечных тэатраў у Магдэбург для ўдзелу ў праекце рэжысёра Аляксея Ляляўскага "Ідэальны свет". Разам з нямецкім дуэтам, які выконвае старадаўнія нямецкія песні, будзе іграць у Опернай зале горада Хайля. Завітае на фестываль у Адэсу, дзе будзе ўжо не ўпершыню агучваць нямое кіно. І гэта далёка не ўсе прапановы-запрашэнні!

Надзея БУНЦЭВІЧ

— Яшчэ крыху, і вас можна будзе назваць "чалавекам свету". А ці аказала Магілёўшчына ўплыў на фарміраванне вашай асобы?

— З першым азначэннем — без сумневу, перабольшванне. А нарадзіўся я сапраўды ў Жылічах Кіраўскага раёна. Вёсак і пасёлкаў з такой назвай на Беларусі многа. На адной толькі Гродзеншчыне іх, здаецца, ажно шэсць. Але нашы Жылічы — самыя славутыя. Бо там знаходзіцца знакаміты Палац Булгакаў, пабудаваны ў XIX — пачатку XX стагоддзя. Звычайна кажуць, што архітэктура — гэта застылая музыка. А для мяне яна адразу асацыюецца з людзьмі. Зусім не таму, што мая маці — дырэктар гэтага Гісторыка-культурнага музейнага комплексу. Бо адразу паўстаюць нават не тыя людзі, якія знаходзяцца тут зараз, а тыя, хто тут калісьці жыў. Хто ўсё гэта будаваў. Хто вывучаў мясцовасць, прыдумваў сам праект, рабіў разлікі, чарцяжы. І ў выніку ўзнікла і захавалася штосьці тое, што... не ведаю, як бы гэта лепей сказаць...

Ягор на хвіліну задумваецца, потым усміхаецца і працягвае — ужо зусім у іншым тэмпарытме, быццам пасля павольнага ўступу і прыпынку на паўзе пачалася імклівая галоўная партыя буйной санатна-сімфанічнай кампазіцыі:

— Архітэктура, як і прырода, насамрэч вельмі "гаваркая". Толькі гавораць яны на розных мовах. У прыродзе не бывае абсалютнай цішыні. У кожнай яе з'яве — ад спеваў птушак ці гучных грамавых раскатаў да ледзь чутнага подыху паветра — ёсць свая музыка. Не ўнутраная, "схаваная", а самая што ні ёсць сапраўдная, заснаваная на рытміцы, гукавышыннасці, тэмпавых суадносінах. Архітэктура ж не дае такой рэальнай, "агучанай" мелодыкі. Яна быццам створана з гістарычных спасылак, стылёвых алюзій — з адных намёкаў. І ўсё! Але тыя павінны загучаць у нашай галаве. Скажаце, надта складана? Ды не, вельмі проста! І адначасова — парадаксальна. Бо такі, здавалася б, абсалютна матэрыяльны носьбіт, як збудаванні, пазбаўлены "рэальнага" музычнага ўвасаблення. А нейкія прыродныя шамаценні, адчуванні-уражанні, штосьці, на першы погляд, цалкам "віртуальнае" — калі ласка, маюць жывое гукавае адлюстраванне. Калі ж старадаўні палац, той жа маёнтак Булгакаў ("Жылічскі Версаль", як яго яшчэ называюць), знаходзіцца ў парку, дык паміж лісцем і цаглінкамі такія, здараецца, дыскусіі разгортваюцца! Куды толькі нашы пісьменнікі глядзяць? Можна было б цэлы цыкл аповедаў зрабіць з тых дыялогаў! І абавязкова на фоне музыкі.

— Пагаджуся, з добрымі лібрэта ў нас заўсёды было напружана. А вы ўжо, відаць, суцэльную оперу пра гэта сачынілі — яшчэ калі там жылі?

— У Жылічах я жыў акурат да таго, як паехаў вучыцца ў Магілёўскае музычнае вучылішча імя Рымскага-Корсакава (цяпер яно называецца каледжам). Ну якія там оперы? Першы свой твор я напісаў ужо ў Магілёве. А ў Жылічах вучыўся ў музычнай школе, у класе свайго бацькі. Так што з тым, на якім інструменце лепей іграць, праблем не стаяла, бо і бацька і дзед былі баяністамі. Дый мае браты таксама сталі музыкантамі. Можна сказаць, дынастыя! Малодшы, Рома, паехаў у Прагу, вучыцца там кампазіцыі. Сярэдні, Косця, таксама скончыў нашу Акадэмію музыкі, зараз выкладае ў Магілёве. З вучняў малодшых класаў ён склаў баянна-акардэонны аркестр — між іншым, адзіны ў краіне з такімі юнымі музыкантамі. І заняў з ім першае месца на абласным конкурсе. Ён такі малайчына, працягвае бацькаву справу. А з мяне педагог — ніякі. Няма ў мяне да гэтага ніякай прагі. Мне бліжэй выканальніцтва, канцэртаванне. Больш падабаецца іграць самому, чым кагосьці вучыць. Гэта, дарэчы, сапраўды вельмі розныя прафесіі.

— Наконт розных прафесій — так яно і ёсць. Але што цікава! Раней многія кампазітары былі адначасова і добрымі выканаўцамі, прычым іграліне толькі сваю музыку. У былыя дзесяцігоддзі з'явілася іншая традыцыя — сумяшчэння творчай дзейнасці з педагагічнай. Сярод прызнаных беларускіх кампазітараў цяжка знайсці таго, хто не выкладае і не выкладаў. Вы ж, як прадстаўнік новага пакалення, вяртаецеся да старадаўняй мадэлі.

— Не, гэта надта спрэчная ўзаемасувязь. Бо мой бацька, паглядзеўшы на нас з Ромам, таксама пачаў сачыняць — для свайго аркестра, баянна-акардэоннага. Так што ён сумяшчае ўсе чатыры прафесіі: баяніста, дырыжора, кампазітара, а найперш — педагога.

— На педагогаў вам, пэўна, увогуле шанцавала.

— Так. Той жа Магілёў доўгі час асацыяваўся ў мяне з Аляксандрам Красікам, у якога я займаўся. Яго ўжо няма ў жывых, але ўсім тым, што ён у мяне ўклаў, я карыстаюся і сёння. Тыя парады і нават сяброўства — засталіся. Толькі на адлегласці. Вельмі сціплы, прыязны, ён ніколі не выказваў свайго пяршынства і тым "выцягваў" мяне на такую ж адкрытасць у стасунках. Звычайна выкладчыкі-выканаўцы даволі скептычна ставяцца да "сачыніцельства" сваіх вучняў, лічаць гэта за нейкую дурноту, ад якой трэба хутчэй пазбавіцца, бы ад хваробы. Ён жа, наадварот, падтрымліваў, вадзіў на кансультацыі да кампазітараў. Дый у выканальніцтве заўсёды звяртаў маю ўвагу на тонкасці музычнай формы, гармоніі, фактуры — усяго таго, што тычыцца ўласна кампазітарскай працы (якую, дарэчы, і павінны спасцігаць выканаўцы, каб лепей данесці аўтарскую задуму да слухача). Мірон Була ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі даў мне іншае — навучыў перамагаць у барацьбе з самім сабой. Ужо на першым курсе ён павёз мяне на самы, бадай, прэстыжны Міжнародны конкурс акардэаністаў у Клінгенталі. Там я, вядома, далей першага тура не прайшоў, але набыў сур'ёзны вопыт, які мне вельмі дапамог на Першым Міжнародным конкурсе імя Жыновіча ў Мінску ў 2002 годзе, дзе я заняў трэцяе месца. Тады гэта была проста нейкая "спартыўная" мара — перамагчы. Пазней я зразумеў, што менавіта з такіх перамог — не над кімсьці, а над сабой — і складаецца жыццё.

— Дык гэта ж адзін з асноўных прынцыпаў педагогікі! Рабіць параўнанні не з іншымі, а з самім сабой — учорашнім. Каб заўтра стаць лепшым. А вы яшчэ кажаце, што выкладчыцкая дзейнасць вам супрацьпаказана!

— Можа, да яе таксама трэба прыйсці. Пакуль жа чым далей, тым больш я прыходжу да думкі, што колькі і чаму нас наўмысна ні вучылі б, галоўным настаўнікам заўсёды было і будзе само жыццё. І ўсе тыя, з кім мы ў ім сутыкаемся. Бо той жа Магілёў асацыюецца ў мяне яшчэ і з лялечным тэатрам, з яго галоўным рэжысёрам Ігарам Казаковым, з якім мы працавалі над "Гамлетам". Увесь той час я ў поўным сэнсе жыў у тэатры, мне ўдалося літаральна "зрасціся" з трупай. Любыя ідэі, прапановы адразу абмяркоўваліся, часам выклікалі дыскусіі, але так і нараджалася агульная канцэпцыя, якая з'яднала ўсе складнікі спектакля ў непадзельнае цэлае. А колькі яшчэ ў мяне такіх "непавучальных настаўнікаў" было! І гурт "НагУаль", сустрэча з якім дала новы штуршок для кампазітарскай творчасці, і кабарэ-бэнд "Сярэбранае вяселле", з якім я супрацоўнічаў, і дуэт "Гурзуф", дзе акрамя мяне быў яшчэ барабаншчык Арцём Залескі, і нават дзіцячы ансамбль "Зубраня" пры Палацы культуры МАЗа, дзе я працаваў канцэртмайстрам ужо з другога курса Акадэміі. А як многаму навучыў мяне Аляксей Ляляўскі!

— Вы стварылі музыку ўжо да некалькіх яго спектакляў, у тым ліку замежных. Тая ж "Сіняя птушка", можна сказаць, "прыляцела", калі вы яшчэ ў Акадэміі вучыліся. Потым былі і "Шоўк" (разам з "электроншчыкам" Віталіем Гармашам), і "Ладдзя Роспачы". Зразумець, што вы кампазітар, прычым менавіта тэатральны, можна было ўжо, пачуўшы вас (і ўбачыўшы, што таксама вельмі важна!) на тым конкурсе імя Жыновіча. Бо гэта было зусім не строгае акадэмічнае выканальніцтва, неабходнае для вышэйшай конкурснай прыступкі, а пластычна-эстрадны, неверагодны па сумесі жанраў спектакль на тэму "Дзень нараджэння музыкі". Ваша асоба засланяла аўтараў музыкі! Вам было быццам цесна ва ўсталяваных імі межах. А сам баян — вас не "сціскае", не абмяжоўвае?

— Ды гэта класны інструмент! У яго вельмі багатыя, папраўдзе аркестравыя магчымасці. Але, у адрозненне ад раяля (а той, лічыцца, замяняе сабой аркестр), ён можа дасягаць яшчэ і арганных гучанняў. Спачатку мне цікава было спалучыць класіку з рокам. Паспрабаваў сыграць на баяне "метал", а далей пачаў шукаць... мабыць, сябе самога. "Гурзуф" распаўся, затое з'явілася трыа: бас-гітара, барабан, баян...

Ягор Забелаў.

"К" інфармуе

19 — 22 чэрвеня ў Акцябрскім пройдуць заключныя мерапрыемствы VIII Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня". Гэты праект рэалізоўваецца пры падтрымцы Міністэрства культуры, Гомельскага аблвыканкама і Акцябрскага райвыканкама, грамадскага аб'яднання "Беларускі фонд культуры".

Яўген РАГІН

Колькі каштуе брэнд?

Колькі каштуе фэст, пра які фалькларысты распавядаюць з прыдыханнем? А не так і шмат: каля 300 мільёнаў рублёў. Гэта грошы (у роўных долях) Гомельскага аблвыканкама і Акцябрскага райвыканкама. Спрычыняюцца, натуральна, і спонсары. А як жа інакш? "Берагіня" для кіраўніка Акцябрскага раёна Генадзя Сімановіча — што паслухмянае дзіця для клапатлівага бацькі. Ураджаі — справа важная, але і "Берагіня" — клопат не з апошніх. Яна для сэрца і душы. Яна — брэнд, аналагічнага якому нідзе няма.

Нас часта крытыкуюць, што занадта шмат старонак "К" прысвячаем фальклору. Між тым, наракаць на гэта — усё роўна што родную маці крытыкаваць. Усе мы з фальклору выйшлі. А "Берагіня" — мама соцень юных выканаўцаў старадаўніх песень і танцаў. Назваць іх аматарамі проста не выпадае. Яны жывуць тым, што засталося ім ад продкаў. І гэта цягам усяго жыцця мацуе іх душы.

Каб паглядзець на гэты цуд, у Акцябрскі прыязджаюць дзясяткі соцень гасцей. Кожнаму хапае цеплыні агульнага свята. Конкурсныя спаборніцтвы танцавальных пар — майстар-клас для тых, хто лічыць этна-выхаванне асновай станаўлення беларускасці.

Аўтэнтыка — рэч прыцягальная, любоў да яе перадаецца праз свядомасць і душу, замацоўваецца ў генах і "прарастае" ў нашчадках…

К

Сёння, 14 чэрвеня, ад Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі стартуе бібліятэчны велапрабег. Штогадовая акцыя, распачатая ў 2011-м, праводзіцца ў рамках буйнога міжнароднага праекта "Cycling for libraries". Мэта прабегу — абмен прафесійным вопытам, прыцягненне ўвагі грамадства да бібліятэк і чытання.

"Веласіпеднае" вырашэнне

Групы бібліятэкараў адначасова стартуюць з Літвы, Латвіі, Расіі і Беларусі. 19 чэрвеня яны сустрэнуцца ў Каўнасе, дзе пройдзе навуковая канферэнцыя. Як паведамляе "К" галоўны бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Настасся Жарская, група, што стартуе з Мінска, аб'ядноўвае адзінаццаць беларускіх бібліятэкараў са сталіцы (сельскія ды раённыя жаданні паўдзельнічаць не выказалі) і трынаццаць замежных з Расіі, Германіі, Даніі, Швецыі, Латвіі і Фінляндыі. Іх маршрут пры падтрымцы Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі праляжа праз Заслаўе, Маладзечна, Смаргонь, Ашмяны…

Настасся Жарская, што ў чацвёрты раз бярэ ўдзел у акцыі, лічыць "веластасункі" надзвычай карыснымі. Па яе словах, такія нефармальныя акцыі дапамагаюць вырашаць самыя розныя праблемы. Галоўная з іх, як лічыць бібліёграф, у тым, што грамадства стала менш чытаць. Пра гэта і будзе весціся гаворка ў Каўнасе.

Усё, што маю за душой...

(Працяг. Пачатак на старонцы 4.)

Экспанатамі стануць і старадрукі. Асабліва пры ўмове, што бібліятэка-музей будзе пастаянна супрацоўнічаць з бібліятэкай-кнігарняй-букіністыкай. У аўтарскай бібліятэцы цяжка абысціся без аўтарскай кнігі. Мне асабіста падабаюцца міні-арт-выданні: маленькія асобнічкі, зробленыя і афармленыя сваімі рукамі. Каштуюць яны вельмі дорага, таму калекцыя мая павялічваецца марудна. А ў вашай установе гэтым можа заняцца асобнае бібліятэчнае фарміраванне. Толькі б тэксты ў тых выданнях не былі б графаманскімі. Сярод экспанатаў хацеў бы бачыць і фотаздымкі ўсіх (!) помнікаў, пастаўленых у свеце ў гонар літаратурных герояў.

І апошні тып — змяшаны: *бібліятэка-кнігарня-музей-тэатр*. Уяўляеце, што дасць на выхадзе такі магутны кангламерат? Вы запытаеце, які ж для гэтага спатрэбіцца штат. Адказваю: той жа. Аднаго бібліятэкара, калі ён генератар ідэй і аўтар усіх праектаў, для аўтарскай бібліятэкі хопіць. Усё астатняе пры правільнай пастаноўцы спраў рабіць будуць удзячныя чытачы. Яшчэ для гэтага і ў чаргу выстраяцца…

Яўген Рагін:
"...І толькі не трэба мне казаць, што для продажу ды абмену кніг ў бібліятэчных умовах патрэбны дазволы, ліцэнзіі і адпаведная прававая база. Вось прыватнік, ён усяго даб'ецца. **А бібліятэкар-дзяржаўнік?..** Няўжо будучыня — за прыватным кніжным капіталам?!"

Чым бы я яшчэ аб'яднаў свае бібліяпражэкты? Дробязямі, якія заўжды мілыя не толькі сэрцу і душы. Абавязковая рэч — кававы апарат. Аўтарская бібліятэка — гэта амаль сямейны асяродак. Самым актыўным чытачам — ганаровыя пасведчанні, прызы і разнастайныя кніжныя бонусы. Самым горшым, што спазняюцца з вяртаннем, — дошка ганьбы. Далей. Традыцыйнымі павінны стаць сустрэчы з пісьменнікамі — не з графаманамі, а з сапраўднымі і ўсеагульна прызнанымі творцамі. (Калі, да прыкладу, пісьменніка Андрэя Федарэнку афіцыйна запросяць чытачы, ён вокамгненна зазбіраецца ў самую дальнюю дарогу, бо яму ёсць што распавесці і пра "Вёску", і пра бібліятэкараў.) Кветкі (як на Шуміліншчыне), мастацкія выстаўкі, пастаянныя і зменныя (як у Глуску) — гэта само сабой. Любая адметная аздоба стварае хатнюю ўтульнасць. Таму камін ў чытальнай зале — справа зімой незаменная...

К

Ну навошта мне гармідар?

"Ёсць грэх больш цяжкі, чым паліць кнігі. Напрыклад — не чытаць іх". Гэта — Рэй Брэдберы. Ягоныя словы, напісаныя дзясяткі гадоў таму, актуальныя і сёння. А яшчэ больш яны будуць актуальныя заўтра, калі рыдары, планшэты ды смартфоны будуць мець нават дзеткі ў дзіцячых садках, не кажучы ўжо пра іхніх татаў і мамаў.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

І што рабіць у падобнай сітуацыі бібліятэкам? Ладзіць музычныя вечарыны ды конкурсы на лепшыя чытанні вершаў? Усталёўваць у чытальных залах кава-машыны ды бясплатны Інтэрнэт? Але ж ці здолее гэта прыцягнуць у "храмы кніг" чытачоў? Што да мяне, дык я ў гэтым сумняваюся.

Патлумачу, чаму. Справа ў тым, што на маім камп'ютары закачана прыкладна 10 гігабайтаў разнастайных кніг — ад сусветных шэдэўраў да класікаў беларускай літаратуры. Навошта мне ісці ў бібліятэку? Музычныя спевы ды чытанне вершаў толькі перашкодзяць мне чытаць упадабаную кнігу. А заварыць каву або чай я магу і дома.

Тры меркаванні **пра заўтра адной установы**

Бібліятэкай я карыстаюся і буду карыстацца да таго часу, пакуль буду ўпэўнены, што заўсёды змагу знайсці патрэбную мне кнігу. Да прыкладу, зараз я хацеў бы пачытаць творы тых беларускіх аўтараў, што апынуліся ў шорт-лісце нядаўняй Літаратурнай прэміі Гедройца. Ці пагартаць некалькі спецыялізаваных выданняў па дыялекталогіі або па гісторыі беларускай мовы. Калі гэтыя фаліянты будуць чакаць мяне ў Доме кнігі, дык я абавязкова туды завітаю, аддам грошы за сканаванне ці капіраванне патрэбнай літаратуры, пасяджу колькі гадзін у чытальнай зале і, магчыма, нават пап'ю кавы з аўтамата. Але нейкіх іншых бібліятэчных навінак я не прыму. Бо мне не патрэбны падобныя інавацыі з тлумам і слоўным гармідарам, гучнымі размовамі ці песнямі. Я проста хачу мець як мага лягчэйшчы ды прасцейшы доступ да ўлюбёных кніг ды гартаць іх у цішы да спакоі. І гэта ўсё, што мне патрэбна ў бібліятэцы.

Цалкам магчыма, што маладым людзям у храмах кніг патрэбна нешта іншае, але я ў гэтым не ўпэўнены. Навошта ім музычныя вечарыны сярод стэлажоў, калі можна схадзіць на канцэрт? Навошта бясплатны Інтэрнэт, калі сёння доступ у Сеціва настолькі лёгкі і даступны амаль у любой кропцы? Навошта ім удзельнічаць у конкурсе на лепшае чытанне вершаў? Наўрад ці гэта вельмі цікава…

Так што я дакладна не ведаю, якой мае быць бібліятэка будучыні. Я хацеў бы, каб яна заставалася такой, як і цяпер. Магчыма, — з лепшай матэрыяльна-тэхнічнай базай, з утульнымі памяшканнямі ды крэсламі, з вялікім кніжным фондам, з разнастайнай перыядычнай літаратурай і вялізнай колькасцю газет... Як, натуральна, і з вялікай колькасцю камп'ютараў, з бясплатным і даступным выхадам у Інтэрнэт.

Не, я не кажу пра тое, што бібліятэкарам не трэба шукаць разнастайныя падыходы, каб прывабіць наведвальнікаў. Трэба! Напрыклад, варта замаўляць ды выстаўляць у залах тую літаратуру, якую абавязкова будуць чытаць як бацькі, так і іхнія дзеці. Яшчэ няблага было б складаць рэйтынгі новых кніг, расказваць пра кніжныя навінкі ў невялікіх анатацыях, змешчаных дзе-небудзь на сценах у чытальных залах, ладзіць конкурсы на лепшага чытача, адорваючы пераможцу новай кнігай — менавіта той, якую ён марыў набыць. А яшчэ — прапаноўваць новыя газеты разнастайнай тэматыкі (чым больш, тым лепш!) у вольны доступ адразу з раніцы — раней за шапікі "Белсаюздруку"…

Юрый Чарнякевіч:
"Цалкам магчыма, што маладым людзям у храмах кніг патрэбна нешта іншае, але я ў гэтым не ўпэўнены. Навошта ім музычныя вечарыны сярод стэлажоў, калі можна схадзіць на канцэрт? Навошта бясплатны Інтэрнэт, калі сёння доступ у Сеціва лёгкі і даступны? Навошта ім удзельнічаць у конкурсе на лепшае чытанне вершаў? **Наўрад ці гэта вельмі цікава**…"

Гэтыя і многія іншыя падобныя акцыі, мабыць, змогуць прывабіць у бібліятэку людзей. Але, на мой погляд, усё адно чытачы ў "храмы кніг" будуць прыходзіць тыя, якія прыходзілі туды заўсёды. Тыя, каму падабаецца пах кніжных старонак і спакой у бібліятэцы. Тыя, што гартаюць новыя выданні так сама, як гарталі кнігі Бібліі ці жыція святых кніжнікі пачатку XII стагоддзя ў Полацку ці Тураве… І цягнуць гэтых чытачоў у бібліятэкі не трэба. Бо яны туды і так завітваюць: хто — штодзень, а хто — штотыднёва.

Прыйдзе туды і моладзь. Па кнігу, што пазначана ў праграме. Па тое, каб даведацца больш пра гарадок Прыпяць ці танк Т-34, якія часта ўпамінаюцца ў любімых камп'ютарных гульнях. Прыйдуць, бо туды будзе часцяком наведвацца ўпадабаная дзяўчына-выдатніца. Прыйдуць, бо бібліятэкарка заўсёды падкажа, што цікавага можна пачытаць у час вясенніх канікул, а пасля ўразіць сваім інтэлектам тую ж каханую дзяўчыну-аднакласніцу… І для гэтага не трэба рабіць з бібліятэкі забаўляльную ўстанову. Трэба даць ёй жыць. Трэба яе проста любіць. Таксама, як і кнігі.

К

А бібліятэка будучыні вам не патрэбная?

Згадалася выдатная назва штогадовага конкурсу: "Бібліятэка як асяродак нацыянальнай культуры". Так-так, бібліятэка — гэта менавіта тое месца, дзе культура не проста выжывае, а дзе яна культывуецца, папулярызуецца, становіцца даступнай для ўсіх і кожнага.

Кастусь АНТАНОВІЧ

Тым не менш, часам даводзіцца чуць: маўляў, калі ў раённай бібліятэцы няма штодня эннай колькасці наведвальнікаў — яе варта закрыць. А чаму б і не, скажа руплівы гаспадар. Дастаткова набыць у Кітаі ды ўстанавіць апарат па выдачы кніг, пра які ў свой час пісала "К". І акупіцца ён за пару гадоў. І нібыта ахопленасць насельніцтва паслугамі сферы культуры застанецца на ранейшым узроўні, а, можа, на паперы яшчэ і вырасце…

Але ж бібліятэка, асабліва сельская, — гэта тое месца, дзе можна перавесці дух ад клопатаў па гаспадарцы, пагутарыць з цікавым (а менавіта такім суразмоўцам і павінен быць бібліятэкар) чалавекам, зрэшты, павысіць свой інтэлектуальны ўзровень. А вось закрыццё сельскіх бібліятэк (можна як заўгодна называць гэты працэс) вядзе да знішчэння таго самага асяродка нацыянальнай культуры.

З іншага боку, як паказвае камандзіровачны досвед, і самі сельскія бібліятэкі ў пераважнай большасці не могуць чымсьці асаблівым пахваліцца, прапанаваць патэнцыйнаму чытачу той спектр паслуг, які быў бы яму цікавы, патрэбны ў паўсядзённым жыцці. Узнікае лагічнае пытанне: чаму, за аднолькавы заробак, адзін бібліятэкар прываблівае да сябе ці не ўсю вёску, людзей розных сацыяльных статусаў ды ўзростаў, а іншы бавіць працоўны час у чаканні наведвальніка? На жаль, гэтых "іншых" значна больш. Яны руплівa вядуць каталог і картатэку, улік чытачоў, ездзяць на курсы павышэння кваліфікацыі, а вынік у іх — нязменны ды несуцяшальны…

Заробак жа аднолькавы і ў "іншых"...

І як не згадаць з гэтай нагоды прыклад набіўшай многім аскоміну сваёй узорнасцю Любаншчыны. Як не прыйсці ў бібліятэку вёскі Камуна, дзе штотыдзень адбываецца тэматычная імпрэза, тыя ж сустрэчы аматараў кулінарыі і практыкуючых садаводаў-агароднікаў. Як не адзначыць выдатны прыклад Ашмяншчыны, дзе бібліятэкарцы з Кальчуноў (між іншым, на пенсіі) хапае сіл ды часу арганізаваць насычаную і змястоўную працу з дзецьмі ды моладдзю, а апрача таго — ладзіць заняткі па аздараўленчай гімнастыцы з мясцовымі пенсіянерамі…

Трэба зразумець, што надышоў час (няхай са мной многія і не пагодзяцца), калі бібліятэка перастала быць выключна пунктам кнігавыдачы (для гэтых мэт існуе бібліобус), а стала сацыякультурным цэнтрам для развіцця вёскі. Цэнтрам, дзе можа быць створана калі не кавярня, то хаця б гасцёўня, цэнтрам, куды з радасцю ўзімку прыйдзе мясцовы рабацяга, а ўлетку — дачнік са сталіцы. Цэнтрам, куды малады чалавек з планшэтам у руцэ прыйдзе не па друкаванае выданне, а па параду, якую кнігу яму спампаваць з Інтэрнэту ды прачытаць у вольны час. Цэнтрам, дзе дзеці змогуць рэалізаваць свае творчыя здольнасці, напісаць першыя нясмелыя паэтычныя радкі…

Кастусь Антановіч:
"Надышоў час (няхай са мной многія і не пагадзяцца), калі бібліятэка перастала быць выключна пунктам кнігавыдачы, а стала сацыякультурным цэнтрам для развіцця вёскі. Цэнтрам, куды малады чалавек з планшэтам у руцэ прыйдзе не за друкаваным выданнем, а па параду, **якую кнігу спампаваць** з Інтэрнэту ды прачытаць у вольны час. "

Такі Цэнтр не вырашыць усіх праблем нашага грамадства, але, прынамсі, зробіць яго больш гуманным, дапытлівым, здольным смела разважаць і мець свой пункт погляду на з'явы, што адбываюцца навокал. І, у рэшце рэшт, дапаможа палюбіць сваю родную Культуру.

К

Бамонд: опера, балет

Танцавальная тэарэма

У Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета прайшоў справаздачны канцэрт Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа.

Фота Анены КЛІВЕЦ

Некалькі гадоў таму на старонках часопіса "Мастацтва" быў апублікаваны шэраг дыскусійных матэрыялаў, прысвечаных стану і перспектывам развіцця айчыннага балетнага тэатра. Было там змешчана і некалькі артыкулаў педагогаў гімназіі-каледжа, якія з болем казалі наконт праблем — і не дробных, а сур'ёзных. Пералічваць ізноў іх не стану.

Заўважу, у пэўны момант прыходзіць на справаздачныя канцэрты каледжа зрабілася нецікава. Ну колькі можна глядзець адно і тое ж? Усё тыя самыя ўрыўкі з тых самых спектакляў, усё тыя ж мініяцюры! Праграма, паказаная гімназіяй-каледжам напрыканцы мая, пераканала: змяніць можна ўсё! Прычым прынцыпова і ў лепшы бок. Калі мець жаданне быць сучасным ды цікавым гледачу. Пачнём з таго, што змяніўся фармат, стыль і нават падача. Раней вядучая за кулісамі бадзёрым (аж да немагчымасці!) голасам аб'яўляла: "Мінкус! Па-дэ-дэ з балета "Дон Кіхот"!" Скажыце, ну хто з фанатаў гэтага віду мастацтва і балетаманаў не ведае, што Мінкусу належыць музыка балета "Дон Кіхот", а Пуні — музыка "Эсмеральды"? Калі менш "помпы" і псеўда-пафасу, застаецца больш часу для вынікаў.

Сёлета каледж паказаў шыкоўную праграму ў двух аддзяленнях. Амаль трыццаць фрагментаў. І яны цікава структураваны. На сцэне дэманструецца ўрок класічнага танца. "Чорны" кабінет, балетны станок, рэпетыцыйнае адзенне. У выніку мы бачым не столькі "кухню" прафесіі, колькі працэс спасціжэння танца. Услед прэзентуецца шэраг варыяцый з класікі ("Капелія", "Арлекінада", "Венецыянскі карнавал", якія не ідуць на нашай сцэне). Яны сведчаць пра тое, як вучні і выпускнікі засвоілі гэтую тэхніку. У такім атачэнні нават хрэстаматыйныя ўрыўкі з "Дон Кіхота" і "Карсара" ўспрымаюцца інакш.

Паказваецца ўрок дуэтнага танца, а далей — найскладаны фрагмент з "Лебядзінага возера". Дарэчы, ён быў выкананы Веранікай Аўчыннікавай і Арцёмам Банькоўскім стыльна, з разуменнем асаблівасцей харэаграфіі. "Белае" адажыа з "Лебядзінага", абранае для выпускнога экзамену, — гэта смелы крок! Запаміналіся пластычныя рукі юнай артысткі, здольнасць надаць паглыбленасці зачараванаму, нават крыху самнабулічнаму, стану герояў. А ўслед за класікай — урокі характарнага ды народнага танца, а таксама сучасная харэаграфія. І ўсюды ў якасці доказаў "танцавальнай тэарэмы" — або свежыя нумары, або хоць і вядомыя, але пераканаўчыя (напрыклад, "Бульба" ў версіі Валянціна Дудкевіча).

Каментарый да ўрокаў ды нумароў давала мастацкі кіраўнік каледжа Інэса Душкевіч, народная артыстка Беларусі, якая на гэтай сцэне станцавала свае лепшыя партыі. Паказаны праект яшчэ раз пераконваў, што танец — з'ява відовішчная, нават калі бачыш рабочыя моманты. "Клас-канцэрт" існуе як тэатральная форма, яна безліч разоў фіксавалася дакументалістамі. У другім аддзяленні ішлі нумары, але — разнастайныя.

Справаздачны праект стаўся і бенефісам педагога Вольгі Лапо. У яе дзявочым класе (менавіта яго прыходзяць глядзець цяперашнія і былыя салісты балета) — дзяўчаты розныя, але пластычна прыгожыя, вытанчаныя па лініях. Рэпертуар, дзе — розныя почыркі (Горскі, Пеціпа, Іванаў, Вайнонен, Баланчын). Кожная паўстала ў двух розных нумарах (класічным і характарным або ў сучаснай харэаграфіі). Складаныя па-дэ-дэ і адажыа. Віртуозныя варыяцыі. Гэтыя імёны — Вераніка Аўчыннікава, Алена Германовіч, Людміла Парэчных, Аліна Пятроўская, Алена Падольская — варта запомніць. Усіх дзяўчат бярэ трупа Тэатра оперы і балета. Спадзяюся, яны там не згубяцца.

Фота Вольгі МАРОЗ

Эфектна ўспрымаліся характарныя танцы (работа педагога Ніны Дзьячэнка). І ўрок характарнага танца, пастаўлены на музыку Ферэнца Ліста. Іспанскі і рускі з "Лебядзінага возера". А яшчэ ў большай ступені — "Цыганскія напевы" на музыку Сарасатэ. Здавалася б, што новага можна сказаць?! Але атрымаўся цікавы нумар са сваёй драматургіяй. Шкадуеш, што мініяцюры з харэаграфіяй Ніны Мікалаеўны так рэдка трапляюць у мінскія канцэрты! Годным фіналам паўставаў польскі баль з оперы Глінкі "Іван Сусанін". Па-першае, опера даўно не ідзе і наўрад ці будзе ставіцца ў бліжэйшы час. Таму з радасцю ўспрымаеш крыху забытую музыку і эфектныя, зладжаныя фрагменты.

Кабінет, станок, фанаты: іспыт на...

І нарэшце — пра сучасную харэаграфію. Яна патрэбна гледачу і выканаўцам як паветра! Такія нумары чакаюць, часам прыходзяць паглядзець менавіта іх, а не даўно вядомую і хрэстаматыйную класіку. Не памятаю, каб у канцэртных праграмах тэатра можна было ўбачыць абойму новых, глыбокіх па сэнсе мініяцюр. Гэткімі падаліся "Лістапад успамінаў" Дзмітрыя Залескага (на маю думку, ад паказу да паказу мініяцюра толькі набірае пачуццяў ды адценняў), "Знойдзеныя і згубленыя" Сяргея Мікелі (нумар крыху загадкавы, востры па пластычным малюнку, з сюррэалістычным адценнем). Ён паказваўся ў Віцебску, на апошнім Міжнародным фестывалі сучаснай харэаграфіі, але ў Мінску не дэманстраваўся. Адметныя па сэнсе і пластычнай мове мініяцюры Юліі Мельнічук "У глыбіні душы", "Тая, што прыходзіць кожную ноч у твае сны" і, асабліва, "Sfumato" (на музыку Пергалезі), дзе тонка выбраная музычная аснова і вакал узмацнялі ўздзеянне харэаграфіі. Мікель і Мельнічук — перспектыўныя асобы. Яны, студэнты Творчай майстэрні Валянціна Елізар'ева ў Акадэміі музыкі, з поспехам прэзентавалі нумары на конкурсах і фестывалях.

Вынікі працы калектыву могуць падавацца сціпла, а могуць — і з размахам, вартым сцэны і традыцый. Каштоўнасць такіх праектаў, як справаздачны, пераконвае ў прэстыжнасці і запатрабаванасці прафесіі артыста балета. У дадатак, калі мы маем такія вынікі, прэзентаваныя стыльна, маштабна, з густам, дык размова пра Акадэмію беларускага балета (ідэя была агучана на пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры краіны, ды тады ж палічылі заўчаснай) праз пэўны час можа зноў зрабіцца актуальнай.

За дзесяцігоддзі наш балет займеў аўтарытэт у свеце. Пра гэта сведчаць і маршруты гастролей, і аншлагі на спектаклях тэатра, і нават кошт білетаў (на балетныя спектаклі ён амаль удвая большы, чым на оперу). Але маюць рацыю і тыя, каму не хапае новых работ, разнастайнасці стыляў, запрашэння ў Мінск вядомых харэографаў свету. Калі гімназія-каледж з такім жа поспехам рушыць і надалей, дык, хто ведае, мо новы творчы ўздым у айчынным балеце пачнецца адтуль?..

Таццяна МУШЫНСКАЯ

Мастыхін

"Сёння" заблукала ва "ўчора"?

Выстаўкі, якія маюць статус абласных, рэспубліканскіх, нацыянальных, для мяне звычайна больш цікавыя за персаналіі. Справа ў тым, што, маючы ўяўленне пра здольнасці і вектар творчасці канкрэтнага мастака, ужо і не чакаеш ад яго сюрпрызаў. Персанальная выстаўка — часта падсумаванне, а не пошук. А вось на вялікай імпрэзе, якая збірае творцаў цэлага рэгіёна ці нават усёй краіны, прыемныя неспадзяванкі час ад часу здараюцца. Гэтаму спрыяе сама атмасфера творчага сумоўя. Там, дзе ў наяўнасці параўнанне, мусіць з'явіцца і канкурэнцыя. А для гледача такая акалічнасць павялічвае верагоднасць адкрыцця новага імені, знаёмства з тэндэнцыяй, якая яшчэ толькі запачаткавалася, усведамлення сэнсавых ці тэматычных дамінант культурнага працэсу. Такім чынам, глядач сам настроены на інтэлектуальную працу, а не на чыста эмацыйнае ўспрыманне пабачанага.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Фрагменты выстаўкі. / Фота аўтара

"Скульптура: XXI": пошукі, а не знаходкі?

Фармат не прадугледжваў экспанавання манументальных твораў. Адзінае выключэнне — "Шэры конь" Сяргея Бандарэнкі, што вылучаецца сярод станковай пластыкі масай і праз тое ўспрымаецца як галоўны аб'ект выставачнай прасторы. Я не ведаю, бы горада. Але не маючы перад вачыма архітэктурнай прывязкі да канкрэтнага асяроддзя, цяжка меркаваць, ці адпавядаюць яны свайму перспектыўнаму прызначэнню.

Працягам агульнабеларускай экспазіцыі скульптуры ў якасці ейнай складовай часткі ў Палацы мастацтва ладзілася выстаўка памяці Галіны Гаравой. Творчасць гэтай выбітнай асобы вартая адмысловай гаворкі. У дадзеным жа кантэксце мушу адзначыць, што побач са скульптурамі Гаравой я адчуваў сябе ў сённяшнім часе, у цудоўным і роспачным XXI стагоддзі. Хоць храналагічна належыць стагоддзю папярэдняму. У работах ёсць тая глыбіня і шматпланавасць, якіх бракуе на групавой выстаўцы… У творчасці Гаравой маецца стрыжань — сэнсавы і маральны. Такі вось парадокс: думаў мастак пра сваё, маляваў тое, што хвалявала, а атрымалася карціна часу. Таго, што ёсць, і таго, што будзе. Толькі пазачасавае мастацтва можа быць люстэркам часу. Такім мастаком была Галіна Гаравая.

К

Мастыхін

Толькі вандроўнікі

У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь Пад назвай "Мы толькі вандроўнікі" праходзіць выстаўка памяці выдатнага беларускага мастака Віктара Кліменкі.

В.Кліменка. "Букет з птушак".

Свет акварэлей Кліменкі — бязмежна вялікі і, адначасова, кранальна малы, але, як складаная духоўная матэрыя, расшчэплены на імгненні, рухомы і далікатны. Усё служыць мастаку крыніцай натхнення: тэкст, музычныя пасажы і нават паўсядзённасць. Яе змястоўнасць выткана з вобразаў, што нагадваюць аголеную душу, з тонкіх дый лёгкіх коларавых спалучэнняў, якія стараюць вібрацыю святла і паветра, з пачуццяў, што ахінуты тонкім каштоўным вэлюмам. Гэты зачараваны свет мастака дазваляе і нам вось так, спакойна, сысці ў сябе, насыціць сябе задуменнем. Элегантныя сілуэты, плаўныя рухі, вытанчаныя абліччы, погляды, скіраваныя ў нябачнае, нешта ледзь адчувальнае напаўняе творы атмасферай сузірання.

Акварэль, жывапіс, малюнак і кніжная графіка дапамагаюць усвядоміць усю невычэрпнасць вобразаў, сцэна дзеяння якіх не звязана ні з часам, ні з прасторай. І, здаецца, не рука творцы, а нясцерпны сум старадаўняга клавесіна так непасрэдна ды арганічна выткаў тонкі вэлюм са святла, паветра ды рамантычнага флёру, ахутаўшы ім смутак па мінулым… І ўсё ж менавіта мастак стварыў свой культ адчування, і тактыльная адчувальнасць таго, што адбываецца ў глыбіні карціннай плоскасці, дазваляе нам не ўцячы ад рэчаіснасці, а акунуцца ў яе духоўную Айкумену.

Вольная і нязмушаная манера пісьма ўласцівая творам мастака. Яны ахоплены адчуваннем далікатнасці "Зачараванага свету", агучаны мелодыяй дыялога "Хлопчыка і птушкі". З якім дзіўным пачуццём меры мастак расстаўляў акцэнты святла і колеру! Мяккасць фактурных пераходаў і незвычайная музычнасць у рытмічнай арганізаванасці кожнага сюжэта падобная да лёгкіх скрыпічных пасажаў.

Разам з тым, асаблівасці вобразнага ладу, маральна-мастацкія праблемы, насычанасць магутнай драматычнай стыхіяй вылучаюць творы, прысвечаныя евангельскім сюжэтам, у якіх урачыстая выразнасць вобраза раскрываецца з кожным ударам структурнага рытму. Уяўленні мастака пра феномен біблейскай прыпавесці па-майстэрску завуаліраваны ў розныя сэнсавыя кантэксты, і мы бачым добра знаёмае, што прайшло ў пераламленні сучаснасці. Усё працята святлом ды колерам. У поліфаніі палітры акцэнты белага ствараюць рухомую коларавую гаму, у нетрах якой нараджаюцца новыя вобразы.

Дакладнасць і яснасць аўтарскай манеры вылучаюць афорты Віктара Кліменкі. У іх мастак не імкнуўся дамагчыся адчування святла і разнастайнасці фактур, але скульптурная аб'ёмнасць прадметаў заўсёды ўтрымлівае сэнс. Чорны колер часта сыходзіць у глыбокія цені, у заліўку фону, як у творы "Час, які ўцякае". У кніжнай ілюстрацыі мастак пазбягаў складаных камбінаторыкі форм, але насычаў яе толькі яму вядомым адчуваннем адкрыцця. І, здаецца, мастак зрабіў толькі крок ад сузірання да драмы літаратурнага сюжэта, а складанасць і структурнасць мыслення надалі яго ілюстрацыям асаблівую грунтоўнасць. Несумненна, вытокі кніжнай графікі мастака ляжаць не толькі ў нетрах літаратурнага тэксту, але, перш за ўсё, у марах і падарожжах памяці, ва ўяўных светах, якія вабяць да нязведаных берагоў. У ілюстрацыях да такіх твораў, як "Дзеці капітана Гранта" і "Тры мушкецёры", "Востраў загінулых караблёў" і "Востраў скарбаў", мастак пашыраў кола сваіх тэхнік, здольных раскрыць дух літаратурнай крыніцы.

У ілюстрацыях да "Песні пра зубра" ў поўнай меры выявілася творчая свабода. Магутная драматычная стыхія ахапіла ўсе аркушы гэтай серыі. Мы бачым гімн мужнасці, гераізму і сіле. Твор Мікалая Гусоўскага воляй мастака стаў сімвалам доблесці і моцы. Тое выказана ў шырокіх пастозных мазках тэмперы, у дынамічных паваротах фігур, у патоках асляпляльна-белых, чырвоных і вогненных водбліскаў.

І, здаецца, што гэты досвед "духоўных станаў", так па-майстэрску паднесены нам мастаком, ёсць візітоўка творчасці Віктара Кліменкі.

Людміла ЛАДЗЯНАЯ, мастацтвазнаўца

В.Кліменка. "Лунае скрыпкі ўздых".

Камертон

Беларускі кампазітар Аляксандр Літвіноўскі, вядомы сваімі працамі ў розных жанрах і стылях, уключаючы мініімалісцкія і электронныя, перамог на Міжнародным конкурсе харавых твораў у ЗША, дзе было каля 600 удзельнікаў.

Аляксандр Літвіноўскі.

Надзея БУНЦЭВІЧ

"Кастынг" для рэпертуару

Кампазітарскія конкурсы адрозніваюцца ад выканальніцкіх тым, што звычайна праходзяць "безменна" — прыблізна так, як літаратурныя ці драматургічныя. Журы разглядае толькі тэксты (у дадзеным выпадку — нотныя), не ведаючы, хто іх аўтар. Але беларускія творцы ў такіх спаборніцтвах удзельнічаюць нячаста. У савецкія часы — папросту не было такіх магчымасцей, а сёння многія кажуць, маўляў, навошта? Праўда, быў рэзкі зрух у 1990-я, калі пры Беларускім саюзе кампазітараў узнікла Асацыяцыя сучаснай музыкі, якая ў хуткім часе ўвайшла ў такую ж міжнародную суполку кампазітараў-авангардыстаў з цэнтрам у Амстэрдаме. Дасылаючы свае новыя творы, кампазітары мелі магчымасць патрапіць на Міжнародны фестываль авангарда "Сусветныя дні музыкі". Тады, мабыць, і прыйшоў да іх першы смак перамог. Але потым наступіла "заціішша".

— Знайшоў у Інтэрнэце інфармацыю пра "International New Music Competition", — распавядае Аляксандр Літвіноўскі, — даслаў сваю партытуру, не пераследуючы ніякіх мэт. Але, прызнацца, быў вельмі ўзраваны, атрымаўшы абвестку, што прайшоў у фінал, дзе абраныя дзесяць твораў будуць выконвацца жыўцом, каб канчатковы выбар рабіла публіка. Харавое выканальніцтва ў Амерыцы развіта добра. У адным толькі Нью-Ёрку каля 400 хароў, сярод якіх ёсць як прафесійныя, так і аматарскія. Хор "Khorikos", які праводзіў конкурс, — прафесійны, ён можа дазволіць сабе папаўняць рэпертуар праз буйны міжнародны конкурс, атрымліваючы безліч кампазітарскіх прапаноў з усяго свету і абіраючы з іх самае арыгінальнае і па-мастацку каштоўнае. Ну, а мне з'ездзіць у Амерыку было цікава яшчэ і тым, што атрымалася гэта выпадкова, ці так было задумана, але па-майстэрску выкананая скульптура выклікае ў памяці вобразы даўніны — знакамітыя конныя статуі італьянскага Рэнэсансу — і ўсё ж не стасуецца з разуменнем "XXI стагоддзе".

Кожны скульптар, робячы станковую работу, усё адно марыць, што калі-небудзь у павялічаным памеры яна аздобіць ландшафт. Нефігуратыўная пластыка, якую можна назваць умоўна дэкаратыўнай і якой на выстаўцы мелася шмат, глядзіцца як эскізы аздоблення пад конкурсна-фестывальныя імпрэзы пашыраецца далягляд, набываюцца творчыя кантакты, якія могуць быць карыснымі для абодвух бакоў.

З кампазітараў, як вядома, хутчэй "выціснеш" ноты, а не словы. Але па запісе канцэрта ў Інтэрнэце, можна было ацаніць не толькі твор, але і шквал апладысментаў, якім публіка віталa нашага аўтара.

І ўсё б добра, ды ўзнікаюць адразу некалькі не самых суцяшальных думак. Ці могуць нашы вядучыя творчыя калектывы дазволіць сабе такі конкурс — хаця б сярод айчынных аўтараў? На грамадскіх пачатках, як гэта рабіў у тыя ж 1990-я Беларускі саюз кампазітараў, абвяшчаючы конкурсы на камерныя творы (адзін — для кантрабаса, другі — для трох выканаўцаў), — вядома, могуць. Але ж ці захочуць? І ці адгукнуцца самі творцы? А між тым, такі ход, асабліва калі конкурс атрымаўся б міжнародным, мог бы і выканальніцкі калектыў папулярызаваць, і новыя творчыя імёны адкрыць, і публіку прывабіць.

К

Хочаш даплату?

Лельчыцы: **платныя паслугі, метады павышэння заробкаў і аптымізацыя**

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Але, як ужо казаў, зрэдку да гэтай сумы дадаюцца прэміі, а яшчэ дырэктар установы мае магчымасць усталёўваць даплаты сваім супрацоўнікам. Гэтыя даплаты — ад 5 да 50 працэнтаў ад акладу — прапісваюцца адразу ж пры заключэнні кантракта. Натуральна, з улікам складанасці і выніковасці працы таго ці іншага культработніка. Кантракты падпісваюцца на год, таму, зразумела, кожны супрацоўнік ведае: не будзеш працаваць "на выдатна" — атрымаеш "двойку", гэта значыць — меншую даплату. Таму ўся каманда Цэнтра культуры працуе ў звязцы, а "мазгавыя штурмы", дзе адшліфоўваюцца новыя формы работы і новыя віды платных паслуг сталіся ў кабінеце дырэктара завядзёнкай.

І гэта цалкам заканамерна, бо, як паведамілі мне ў аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, сёлетнія планы падвысіліся на 14 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам. Таму і шчыруюць мясцовыя культработнікі, што называецца, напоўніцу, каб выйсці на запланаваныя паказчыкі. Як кажуць, хочаш жыць — умей круціцца…

І бібліятэкар, і артыст

Ці можа здзівіць бібліятэка чытача і журналіста, які бачыў сотні падобных установаў? Раней думаў, што — не. Але, як аказалася, памыляўся. Бо калі завітаў у Лельчыцкую дзіцячую раённую бібліятэку, цэнтр для дзяцей і юнацтва, здзіўляўся на кожным кроку. І першае маё здзіўленне было ад сустрэчы з Аленай Ляхавец — дырэктарам установы, якая ладзіла мне экскурсію па сваім "храме кніг". Раней яна працавала намеснікам дырэктара Лельчыцкага цэнтра культуры, курыравала там працу з дзецьмі, а, перайшоўшы ў дзіцячую бібліятэку, увесь свой набыты вопыт выкарыстала на новай пасадзе. Прычым, як чалавек адказны, Алена Адамаўна сабрала ў сваёй установе таксама толькі актыўных і зацікаўленых супрацоўнікаў. Бо слушна лічыць, што "вельмі сумна толькі кніжкі выдаваць, а працаваць добра можна і трэба ў тандэме з цікавымі і творчымі людзьмі".

"Уладанне" Алены Ляхавец — утульная бібліятэка з разнастайнымі цікавымі папяровымі "цацкамі" на сценах і шафах, са светлымі кабінетамі, камп'ютарнай ды чытальнай заламі, з сотнямі газет і часопісаў на любы густ. Але гэта, натуральна, яшчэ не ўсё. Ёсць тут і сем клубаў па інтарэсах, сярод якіх — творчая студыя "Пчолка", якой кіруе Святлана Лебедзева — майстрыха, што называецца, на ўсе рукі. Яна і шые, і робіць лялькі, і малюе, і займаецца з дзецьмі роспісам ды выцінанкай. Адным словам, Святлана Уладзіміраўна — не проста бібліятэкар, а творца. Як, дарэчы, і ўсе тутэйшыя супрацоўнікі. Яны не толькі выдаюць кнігі ды выціраюць пыл з кніжных паліц, а яшчэ і ўдзельнічаюць у працы Клуба маладой сям'і, створанага пры бібліятэцы, а таксама — у шматлікіх імпрэзах, што ладзяцца ў тэатральным гурце.

Пра апошняе — пагадзіцеся, даволі нязвыклае для бібліятэкі аб'яднанне — варта сказаць асобна. Справа ў тым, што менавіта з дапамогай тэатральных спектакляў установа і выконвае план платных паслуг. А ён у дзіцячай бібліятэкі — не маленькі: каля дваццаці мільёнаў рублёў. І большую палову гэтай сумы дае менавіта названы гурт. Рэпетыцыі ладзяцца тут жа, у бібліятэцы, а таксама на сцэне Цэнтра культуры. Таму дырэктар бібліятэкі з'яўляецца адначасова яшчэ і рэжысёрам-пастаноўшчыкам, а бібліятэкары і маленькія чытачы — сапраўднымі артыстамі. І калі раней такое існаванне адной асобы ў дзвюх іпастасях падавалася дзіўным, дык цяпер да гэтага прызвычаіліся ўсе: і супрацоўнікі, і наведвальнікі.

Спектаклі "ад бібліятэкараў" для маленькіх і дарослых жыхароў Лельчыц — кшталту "Маша у Трыдзявятым Царстве", "Маленькая Баба Яга", "Чараўнік Дыяментавага горада" — настолькі карыстаюцца попытам, што даводзіцца ладзіць па дзве пастаноўкі ў дзень: усе ахвотныя ў глядзельнай зале РЦК папросту не змяшчаюцца. А яшчэ тэатральныя імпрэзы пад час навагодніх ранішнікаў упадабалі дзеці супрацоўнікаў мясцовага аддзялення "Беларусбанка"… Чаму б такім прыкладам "тэатральна-бібліятэчнага жыцця" не скарыстацца ў іншых рэгіёнах? Вынік у маштабах рэспублікі быў бы, на маю думку, вельмі значны.

Натуральна, большая частка грошай адразу ж ідзе на ўмацаванне матэрыяльнай базы. Напрыклад, менавіта такім чынам у бібліятэцы з'явіўся ноўтбук, стацыянарны камп'ютар, швейная машынка і шмат чаго яшчэ… Так што зробленае "мёртвым грузам" тут не ляжыць, а працуе на аказанне ўсё новых і новых паслуг.

І яшчэ. Не магу не адзначыць, што досыць паспяхова ў бібліятэцы працуюць са спонсарамі. Напрыклад, тканіну ды паперу для касцюмаў прадастаўляе спонсар з Германіі, а дабрачынная арганізацыя пералічыла сродкі на рамонт установы, закупку неабходнай мэблі ды іншага абсталявання. Дарэчы, дошка з удзячнымі словамі аблвыканкаму, райвыканкаму, спонсарам і ўсім неабыякавым людзям, што спрычыніліся да з'яўлення ў Лельчыцах Дома кнігі, вісіць адразу ж каля ўваходу ў бібліятэку… Як на мой погляд, дык таксама вопыт, варты пераймання.

Але спонсарства — спонсарствам, а заробак у бібліятэкараў — такі ж самы, як і ва ўсіх іншых культработнікаў раёна. Па словах Алены Ляхавец, пускаць грошы, зробленыя на аказанні платных паслуг, на прэміраванне не заўсёды атрымліваецца, таму, не здзіўляйцеся, усе бібліятэкары ўдзельнічаюць у народным хоры работнікаў культуры "Зараніца". Бяруць удзел там не толькі з-за любові да спеваў, але і з-за матэрыяльных выгодаў: кожнаму "заранчаніну" дадаецца 25 працэнтаў ад акладу… Вось такія спевы…

З СДК — у Мір і Нясвіж

Не сакрэт, што ў горадзе заўсёды хапае магчымасцей для аказання платных паслуг: варта толькі парупіцца пра адпаведнае "начынне" ды пра прасоўванне той або іншай паслугі на рынак з дапамогай рэкламы. У сельскай мясцовасці і з паслугамі, і з рэкламай мерапрыемстваў — нашмат складаней. Не раз даводзілася бываць у сельскіх установах культуры, у якіх скардзіліся на тое, што на канцэрты і дыскатэкі ніхто не ходзіць, а іншага — нічога не выдумляецца. Дый, маўляў, хто да нас пойдзе…

У аграгарадку "Ліпляны" так ніколі не лічылі і не лічаць. Як прызналася мне дырэктар мясцовага СДК Людміла Лось, вядомая пастанова Савета Міністраў № 582 аб забароне падлеткам да 18 гадоў прысутнічаць на дыскатэках пасля 22 гадзін вечара, адмоўна паўплывала на колькасць наведвальнікаў танцавальных вечароў. Але гэта не сталася для кіраўніцы Дома культуры нагодай для смутку. Яна адразу ж вынайшла іншыя спосабы, каб выканаць план платных паслуг. І пачала арганізоўваць… паездкі па турыстычных "перлінах" Беларусі.

"Мы замаўляем у аддзеле культуры аўтобус, прадастаўляем усе неабходныя дакументы ў бухгалтэрыю, дзе нам разлічваюць выдаткі і рэнтабельнасць, а пасля выдаюць квіткі на па-

> Але спонсарства — спонсарствам, а заробак у бібліятэкараў — такі ж самы, як і ва ўсіх іншых культработнікаў раёна. Пускаць грошы, зробленыя на аказанні платных паслуг, на прэміраванне не заўсёды атрымліваецца, таму, не здзіўляйцеся, усе бібліятэкары ўдзельнічаюць у народным хоры работнікаў культуры "Зараніца". Бяруць удзел там не толькі з-за любові да спеваў, але і з-за матэрыяльных выгодаў: кожнаму "заранчаніну" **дадаецца 25 працэнтаў** ад акладу…

На людным месцы

"Каленцы" ананчыцкіх мужчын

8 чэрвеня, на "зялёныя святкі", у вёсцы Ананчыцы Салігорскага раёна прайшоў VI Рэгіянальны фестываль фальклорнага мастацтва "Сугалоссе".

БАРЫСАЎШЧЫНА

На палянцы, акружанай дубамі, сабралася 17 калектываў з розных куткоў Мінскай вобласці, каб падзяліцца творчым натхненнем. Адкрываўся фестываль траецкім абрадам кумлення і агульным карагодам, у які запрашаліся ўсе: і калектывы-ўдзельнікі, і гледачы, і ганаровыя госці. Гэта яшчэ больш зблізіла людзей, стварыла атмасферу сяброўства ды еднасці, якая захавалася на працягу ўсяго свята.

Першым выступіў народны фальклорна-этнаграфічны калектыў Ананчыцкага СДК. Па эмацыйным напружанні не адсталі ад Ананчыц і песні Старадарожчыны ў выкананні народнага фальклорнага калектыву "Набіліцы" Баранаўскага СДК. І завіраваў святочны калаўрот: спевы змяняліся танцамі, за карагодамі ішлі інструментальныя найгрышы, весялілі людзей старадаўнія гульні з Мядоцкага краю Барысаўшчыны.

Цікава адзначыць, што танцавалі ананчыцкія мужчыны, прычым менавіта танцавалі, а не проста "дзёргаліся", як тое часта бывае, пад жывую музыку. Гледачы выдавалі такія "каленцы", што кіраўнікі калектываў, харэографы і ганаровыя госці здымалі іх на відэа! Фестываль фальклорнага мастацтва зрабіў неверагоднае: мужчын не трэба было прасіць паказваць танец, наадварот — перыядычна іх прасілі вызваліць пляцоўку для калектываў.

Праграма свята была пабудавана прафесійна — эмацыйны ўздым не спадаў ні на хвіліну. Асноўнымі ж гледачамі сталі самі калектывы, жыхары вёскі Ананчыцы і запрошаныя спецыялісты з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Інстытута культуры Беларусі, Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці. Як часта бывае, бракавала рэкламы і фінансавання. Хаця адзначу знаходлівасць мясцовых культработнікаў: яны размясцілі ўказальнікі-запрашэнні на пад'ездзе да Ананчыц, таму гасцям прасцей было знайсці дарогу, а выпадковыя падарожнікі маглі скарыстацца імі і зазірнуць на свята.

Настасся КОМЛІК-ЯМАЦІНА,
вядучы метадыст па фальклоры Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці

Мужчыны танчаць пад музыку ад "Расіцы".

Ананчыцкія музыканты і спявачкі.

Шэсце ўдзельнікаў "Сугалосся".

Алена Ляхавец і лялькі тэатральнага гуртка.

Святлана Лебедзева.

СДК у Ліплянах.

Спявай!

ездку, — распавяла Людміла Лось. — Нашы экскурсіі карыстаюцца попытам, бо выходзяць даволі таннымі. Напрыклад, паездка ў Мазыр, на гарналыжны комплекс, каштавала 50 тысяч, вандроўка па святых месцах ажно да Жыровіч "пацягнула" на сто пяцьдзясят... І ўсе вельмі задаволены гэтымі коштамі, так што сабраць 20 чалавек для мяне — не праблема". Вось так, пры дапамозе дырэктара СДК, многія жыхары Ліплян пабывалі не толькі ў Жыровіцах, але і ў Міры, Нясвіжы, у аквапарку Кобрына, у гомельскім цырку ды ў многіх іншых гісторыка-культурных месцах Беларусі…

Дадам, што ў Ліплянах зарабляюць не толькі гэтым. У СДК, натуральна, ладзяцца платныя канцэрты і дыскатэкі, навагоднія ранішнікі і агеньчыкі. Але і гэта яшчэ не ўсё. Некалькі гадоў таму Людміла Лось пабывала на курсах перападрыхтоўкі ў Інстытуце культуры Беларусі. Паехала туды не проста так, а захапіўшы прэзентацыйныя матэрыялы па дзейнасці сваёй установы і народнага фальклорнага гурта "Вяснянка", што працуе пры ўстанове ўжо дзясяткі гадоў. Пад час вучобы кіраўнік СДК пазнаёмілася з адной з супрацоўніц Музея народнай архітэктуры і побыту, якой вельмі спадабаўся фальклорны калектыў. Таму праз некаторы час "Вяснянка" атрымала запрашэнне выступіць у Азярцы. Зразумела, не бясплатна. Першае выступленне прайшло, што называецца, "на ўра", за ім пасыпаліся запрашэнні выступіць яшчэ і яшчэ… Таму ўжо неаднойчы ў Азярцы фальклорны гурт з Лельчыцкага раёна прадстаўляў то "Масленіцу", то абрады "Дажынкі" ды "Зажынкі"...

Вынік, як на мой погляд, заканамерны. Бо, як вядома, пад ляжачы камень вада не пацячэ. Або, як не аднойчы казала мне няўрымслівы дырэктар з Ліплян: "Хто грукае — таму адкрываюць". Але ж, натуральна, трэба мець чым грукаць! Людміла Лось — мае. Вось і на курсы перападрыхтоўкі паехала, набраўшы з сабой цэлы пачак разнастайных матэрыялаў пра дзейнасць свайго клуба. Узяла не таму, што на штосьці спадзявалася, а таму, што заўсёды гатовая да новага, да новых магчымасцей… Вось таму ўсё, прывезенае ў Мінск, ёй і спатрэбілася…

Ды і цяпер, як кажа Людміла Лось, яна заўсёды ў пошуку, ніколі за сваім вялікім дырэктарскім сталом у СДК не заседжваецца. А ідзе да людзей, прапаноўвае з'ездзіць у вандроўку па новым маршруце, "палюе" на грошы для паездкі сваіх калектываў за межы раёна. Напрыклад, не так даўно знайшла фінансавыя сродкі для паездкі ў Курск на Расійскі фестываль дзіцячых фальклорных гуртоў. Туды адправіўся ўзорны калектыў "Карагод", што існуе пры Ліплянскім СДК. Частку грошай даў райвыканкам, частку — зарабілі самі, а яшчэ дапамаглі спонсары. Дарэчы, з Курска ліплянскія хлопчыкі і дзяўчаты прывезлі ўзнагароду фестывалю.



Так у Лельчыцах аддзячылі спонсарам.

Зараз і ў іншых сельскіх Дамах культуры Лельчыцкага раёна пачалі пераймаць вопыт Людмілы Лось ды арганізоўваць экскурсійныя паездкі па Беларусі. Бо карысць ад гэтага — навідавоку. Напрыклад, Ліплянскі СДК павінен зарабіць за год 20 мільёнаў рублёў. Як прызналася мне кіраўніца клуба, прыкладна 15 мільёнаў яна ўжо мае… Так што план платных паслуг у аграгарадку перавыканаюць абавязкова… А дзякуючы тым грошам мясцовыя клубнікі ўжо карыстаюцца новым ноўтбукам, шыкоўным фотаапаратам, радыёмікрафонам і многім іншым…

Атракцыён непадалёк ад установы культуры, але — ад прыватніка.

Рамонт вядзе гаспадарчая група аддзела.

Дарэчы, па выніках года ўстанова ў Ліплянах была прызнана ў раёне лепшай сярод усіх СДК. А за перамогу ў конкурсе выдаваўся не толькі дыплом, але і неблагі грашовы дадатак: пяць мільёнаў рублёў. Так што працаваць вельмі добра — гэта яшчэ і вельмі карысна. На тыя, атрыманыя за перамогу, грошы Людміла Лось набыла для ўстановы газонакасілку: цяпер трава каля Дома культуры расце толькі "культурная"…

У якасці заключэння

У гасцініцы "Убарць", дзе мне давялося начаваць пад час камандзіроўкі, на першым паверсе стаіць невялічкая зашклёная шафа. Яе не мінае ніводны заезджы ў Лельчыцы вандроўнік. Справа ў тым, што ў ёй месцяцца разнастайныя сувенірныя вырабы мясцовых майстроў з раённага Дома рамёстваў. І як казалі мне супрацоўнікі гатэлю, сувеніры тыя — запатрабаваныя. За іх продаж гасцініца бярэ 20 працэнтаў ад сумы, а ўсё астатняе ідзе ў план платных паслуг РДР…

Кажу пра гэта таму, што давялося бываць у Лельчыцах гады тры-чатыры таму, а таксама жыць у "Убарці". Дык вось, пра сувенірную прадукцыю ў холе гасцініцы не было тады ані згадкі.

Натуральна, у сферы культуры Лельчыцкага раёна хапае сваіх праблем. Да прыкладу, патрабуе рамонту будынак цэнтральнай раённай бібліятэкі: зараз чытальная зала ўстановы даводзіцца да ладу сіламі гаспадарчай групы, праўда, досыць марудна. Таксама, па словах старшыні мясцовага райвыканкама Аляксандра Капыткова, яго вельмі непакоіць кадравая праблема, асабліва ў сельскай мясцовасці, а яшчэ — развіццё сферы турызму ў раёне… Але гэта, мабыць, тэмы для іншых артыкулаў.

К

Захапіць любоўю да народнай песні вельмі лёгка тады, калі яна гучыць паўсюль. Але падобнай карціны не назіраецца. Густы сучасных дзяцей і моладзі — вельмі розныя, а музычны фальклор не з'яўляецца прыярытэтным кірункам. А каб тыя скарбы адкрыць для дзяцей ды падлеткаў, варта звярнуцца да досведу харавых калектываў.

Праекты "Жывіцы"

МІНСК

Ансамбль народнай музыкі "Жывіца", які працуе ў Дзіцячай музычна-мастацкай школе мастацтваў № 1 Мінска, узнік 20 гадоў таму. Яго стваральнікамі былі Лідзія Якімавец, мастацкі кіраўнік, і Віктар Івашка, музычны кіраўнік "Жывіцы". Лідзія Мікалаеўна па адукацыі і першай прафесіі — спявачка, улюбёная ў беларускую песню. Шмат гадоў працавала ў Акадэмічным народным хоры імя Г.Цітовіча. А цяпер сваё захапленне перадае юным артыстам.

Вядома, працаваць у школе мастацтваў, з аднаго боку, цікава, бо сюды прыходзяць дзеці, музычна адораныя. Але ж кожны год склад калектыву змяняецца, у ансамбль прыходзяць новыя выканаўцы. Таму падтрымліваць у належным выглядзе сталы рэпертуар і засвойваць новы — не надта проста. Творчае развіццё падобных калектываў шмат у чым залежыць ад асобы кіраўніка, яго ўмення захапіць і навучыць, ад ягонага густу ды захапленняў, чалавечых якасцей і арганізацыйных здольнасцей.

У Маладзёжным тэатры эстрады "Жывіца" паказала праект, прымеркаваны да 20-годдзя калектыву. Свежыя аранжыроўкі папулярных і раней не вядомых песень, прадуманае афармленне сцэны і светлавое рашэнне — усё стварала атмасферу свята.

Праекты "Жывіцы" робяцца больш разгорнутымі, прадстаўнічымі. У апошнім, вядома, прываблівала свядомая арыентаванасць на беларускамоўныя творы (на жаль, іх цяпер не надта багата на нашай эстрадзе). Шмат тут было і апрацовак народных песень, і аўтарскіх песень кампазітараў У.Алоўнікава, І.Лучанка, А.Безенсон, В.Сярых. Да ліку эмацыйных кульмінацый праграмы я аднесла б драматычную баладу І.Лучанка "Хатынь", якая рэдка выконваецца, а таксама народныя песні "Вёчар цёмны" і "Ой, прасыпаўся ды сухі дубе…" з іх нечаканай стылістыкай ды вобразамі.

Эфектна ўспрымаліся выступленні салістаў — Валерыі Гарбачонак, Сафіі Верашчук, Ганны Атрошчанка, Вольгі Анціпавай.

Таццяна МІХАЙЛАВА

Пасябраваць з лесам

Бяспека жыцця

Многія дзеці пад час летніх вакацый з'язджаюць у летнікі, у вёскі да бабуль і дзядуль, на лецішчы. Але для незнаёмага з "дзікай прыродай" лес можа стаць кнігай, напісанай на чужой мове.

Як знайсці ваду?

Ухіл мясцовасці, з'яўленне папаратнікаў, балотных раслін, збег сцежак, пратаптаных жывёламі, могуць паказаць дарогу да вады. Дажджавая вільгаць захоўваецца ў сагнутых грыбных шапачках. Дапаможа справіцца са смагай ранішняя раса. Абеззаразіць ваду дапаможа бляшанка з-пад кансерваў. Трэба прабіць у дне мноства адтулін, пакласці на адну траціну дрэўнага вугалю, два-тры слаі марлі з аптэчкі — і фільтр гатовы. Ваду можна пракіпяціць, а для абеззаражвання выкарыстаць ёд (дзве кроплі на кубак) ці марганцоўку з аптэчкі (вада павінна стаць светла-руковай).

Як спатоліць голад?

Пра ядомыя грыбы ды ягады ведаюць усе. Дапамогуць і лясныя арэхі. Сасна прапаноўвае "да стала" маладыя пупышкі. Адвар з хвоі дапамагае нават ад цынгі. Найбольш спажыўным лічыцца лыка ад бярозы, клёна, таполі… З жалудоў, зварыўшы іх і падсмажыўшы, вырабляюць муку для прыгатавання кашы ці аладак. Крапіва — цудоўная сыравіна для салатаў.

Як разысціся з жывёламі і змеямі?

Самае галоўнае: не палохайцеся пры сустрэчы з імі. Нават драпежнікі, як правіла, нападаюць на чалавека, калі параненыя альбо ахоўваюць сваё патомства. Таму не рухайцеся, не адводзьце вачэй і не нападайце самі — дайце магчымасць жывёліне сысці. Калі ж яна агрэсіўная, выкарыстоўвайце агонь, крычыце, стукайце палкай па дрэве. Нельга паварочвацца спінай і збягаць. У крайнім выпадку, павольна адступайце да бліжэйшага дрэва.

Змеі любяць грэцца на сонцы. Але нюх і зрок у іх — кепскія. Таму будзьце ўважлівыя пры хуткай хадзьбе: змеі могуць не паспець уцекчы ад вас… Перад атакай змяя скручваецца ў клубок, а потым выкідвае цела на 30-40 сантыметраў. Не забывайцеся, што высокі і трывалы абутак — выратаванне ад ядавітых змей.

Таццяна БЫЧАНОК,
спецыяліст групы прапаганды і навучання Савецкага РАНС Мінска

Практыкум ад...

Майстрыха з Ходасаў пра лёс і прафесію

Колькі памятаю сябе, заўсёды прыцягвала маю ўвагу і захапляла ўсё, створанае рукамі. Ільняныя посцілкі ды ручнікі бабулі, вышыванкі мамы, плеценыя лазовыя кошыкі і нават лапці з лыка суседа — дзеда Андрэя... Яшчэ ў памяці кросны, што стаялі пасярод хаты, і мы, малыя, пільна сачылі, як нашы бабулі спрытна працуюць чаўнаком, ствараючы дзівосныя ўзоры. Рэдкі вечар не збіраліся да нас суседкі на вячоркі, і ў кожнай — ці то вышыванка, ці то вязанне або прасніца. Так і павялося з тых часоў: ніводнай хвіліны дарма. Што-небудзь ды займае рукі.

Праект пачынаецца з...

Крок за крокам

З маленства марыла стаць выхавацелькай. Набыла адукацыю — і ўсю душу аддавала дзецям... Асабліва любіла маляванне. Прыемна бачыць работы, якія ўпрыгожваюць пакоі ды калідоры дзіцячага садка, дзе працавала амаль дзесяць гадоў. Жыццёвая дарога прывяла мяне пасля ў Дом дзіцячай творчасці Мсціслава. Меркавала, што ненадоўга, а засталася на адзінаццаць гадоў. Пачатак быў нялёгкі, хоць і меліся навыкі. Працавала з саломкай, але спынілася на вырабах са скуры. Вучэбных гадзін было недастаткова для самарэалізацыі. Таму, парабіўшы справы дома, садзілася ажыццяўляць які-небудзь праект...

Ідэі для стварэння работ прыходзілі з часопісаў, выставак, успамінаў, калі цёмныя вечары навявалі карціны мінулага дзяцінства — такога далёкага і таму — прыцягальнага... Работы нараджаліся і мелі сваё жыццё: на фестывальных выстаўках, на конкурсах-аглядах, на кірмашовых пляцоўках горада. Нейкія рэчы ішлі на падарункі.

Палюю за...

Асобнае месца ў калекцыі займае льняная сукенка, аздобленая скурай. Работа называецца "Сонца маладзіковае" і прысвечана творчасці Францыска Скарыны. На абласным конкурсе фітамоды "Рамонак" яна атрымала дыплом.

Аднойчы ў рукі трапіла бутэлька цікавай формы... І вось — асобная калекцыя. Кожная мае сваю гісторыю стварэння ды прысвечана пэўнай падзеі. Самая першая мае назву "Восеньскі ўспамін". Яе з'яўленне — мара зноў пабываць на беразе мора, прыемныя перажыванні ўспамінаў пра лета. Затым "Мелодыя" — як памяць пра творчасць Мусліма Магамаева...

Своеасаблівым азарэннем стала стварэнне работы "Энігма". Я толькі выканаўцай была — нібыта нехта кіраваў рукамі і думкамі... Немагчыма растлумачыць, адкуль прыходзіць і куды знікае натхненне. А ў памяці застаюцца такія мілыя сэрцу, прасякнутыя любоўю і душэўнай цеплынёй, упрыгожванні, сувеніры, пано.

У 2011 годзе я была запрошана на Міжнародную фальклорную канферэнцыю ў Магілёве, дзе мне спадабалася ідэя "Навучыўся сам — навучы іншага". Праблема захавання навакольнага асяроддзя, энергазберажэння планеты Зямля для жыцця нашчадкаў, эканомія і беражлівасць з'явіліся штуршком для засваення методыкі пляцення з газетнай паперы, якая прыпыніць знішчэнне лазы, патрэбнай для пляцення.

Навучыць дызайну

Цэнтр культуры аграгарадка "Ходасы", дзе я працую цяпер на пасадзе дырэктара, афармлены работамі, выкананымі ў тэхніцы пляцення з газетнай паперы. На базе Цэнтра арганізавала аматарскае аб'яднанне "Дэкаратыўны дызайн", дзе не толькі сама твару, але і вучу іншых свайму майстэрству. Майстар-класы, якія праводжу раз-пораз, захапляюць людзей розных прафесій.

Чацвёрты год навагоднія святы нашых работнікаў упрыгожваюць рукатворныя стылізаваныя ёлачкі: і цікава, і прыгожа, і прыемна. Вось так аджылыя свой век газеты і часопісы даюць жыццё сухарніцам, вазачкам, дэкаратыўным дрэўцам, нават прадметам побыту — і служаць, і радасць прыносяць.

Ларыса Пашкевіч і яе работы.

Сонечка — для ўнукаў

Час не стаіць на месцы, развіццё не стрымаць, пашыраюцца і інфармацыйныя магчымасці. Неяк зацікавілася стварэннем тэкстыльнай лялькі — і вось на свет з'явілася Сонечка. Затым было шмат іншых — непаўторных, непадобных, са сваім характарам, гісторыяй і жыццём. Але Сонечка — самая дарагая, таму што першая, таму што ледзянец выбірала ёй мо з паўгадзіны, каб быў ён у адной колеравай гаме з сукенкай. Нават прадаўшчыца на мяне стала неяк насцярожана паглядаць...

Кожнаму чалавеку разам з жыццём Бог дае і талент. Вельмі важна заўважыць яго як мага раней, дапамагчы чалавеку знайсці сваё месца ў жыцці, навучыць служыць людзям, ствараць добры настрой, пакінуць нашчадкам плён уласных рук і адметнага розуму...

Так і бяжыць жыццё...

Творчыя захапленні, выстаўкі, конкурсы, фестывалі, ну і, канешне ж, уласны дом — тут жывуць самыя дарагія сэрцу работы. Адны былі створаны пад уплывам нейкіх падзей, успамінаў, іншыя — увасабленне творчага парыву. Сёння яны ўпрыгожваюць мой дом, падтрымліваюць творчую атмасферу, натхняюць на новыя здзяйсненні. А калі мяне не стане — застануцца ў спадчыну маім дзецям і ўнукам...

А як жа, усё пакінуць след павінна...

Ларыса ПАШКЕВІЧ,
дырэктар Цэнтра культуры аграгарадка "Ходасы" Мсціслаўскага раёна

Акцыя на ўзроўні раёна

Шосты год па аграгарадках і школах Навагрудскага раёна вандруе інфармацыйна-краязнаўчы тур Цэнтральнай раённай бібліятэкі "Праз бібліятэку — да дабра і свету".

НАВАГРУДЧЫНА

Сёлета ён, прысвечаны Году гасціннасці, за два тыдні наведаў шэсць устаноў: Шчорсаўскую, Вераб'евіцкую і Пятрэвіцкую сельскія бібліятэкі, гімназію № 2 Навагрудка, Нягневіцкую сярэднюю школу, Кашалеўскую дзіцячую базавую школу-сад. Бібліятэкары Навагрудскай ЦРБ падрыхтавалі для сваіх чытачоў БібліяАнонс "Аграсядзібы Навагрудчыны".

Ад анонсу да ваяжу

Змястоўным стаў і БібліяВаяж "Першая Сусветная: беларускі напрамак". Ён дазволіў акунуцца ў тыя далёкія падзеі, прайсці па лініі фронту, якая знаходзілася за 30 кіламетраў ад Навагрудка. Каля вёскі Дзяляцічы да сённяшняга дня захаваліся акопы, а ў Нягневічах стаіць помнік Першай сусветнай... Мы паказалі дакументальны фільм "Смаргонь. Забыты фронт", зняты ў рамках праекта "Зваротны адлік". У ім, у прыватнасці, вядзецца гаворка пра малавядомыя факты Першай сусветнай вайны: абарона Смаргоні, што доўжылася 800 дзён. Менавіта тут ужылі газавую атаку.

БібліяЭкскурс "Прынямонне" — гэта электронная прэзентацыя славутых мясцін Гродна і ўсіх 17 раёнаў вобласці. Асобная тэма — Аўгустоўскі суднаходны канал, які злучае рэкі Вісла і Нёман.

А вось тэма Вялікай Айчыннай вайны праз адлюстраванне ў мастацкай літаратуры чытачам (асабліва юным) недастаткова вядомая. Прынамсі, склалася такое ўражанне. Таму ўся інфармацыя, якая падавалася бібліятэкарамі ў цікавай форме, дзецьмі ўспрымалася з цікавасцю. Іх вельмі ўразіў буктрэйлер па матывах аповесці Барыса Васільева "А досвіткі тут ціхія...". Дарэчы, ён усюды быў успрыняты на кранальнай ноце. Кніга абавязвае...

Фаіна МАЛЮЖЭНЕЦ,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Навагрудскай ЦРБ

Стратэгія начальніка аддзела

Аптымізацыя і — юрасобы

Ганна СВЯТЛОВА,
Аршанскі райвыканкам:

Орша — не самы маленькі ў Беларусі раён. У выніку маем унікальны па культурным "начынні" край, дзе цэнтр сілкуе творчымі ідэямі і тэхнічнай падтрымкай вёскі ды аграгарадкі. Такі сімбіёз гарадской і сельскай культур і вызначае найперш стратэгію тутэйшага аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі.

— Летась горад і раён аб'ядналіся ў тэрытарыяльную адзінку. На агульную культурную сітуацыю паўплывала пэўным чынам і аптымізацыя нашых устаноў. Узніклі, натуральна, новыя юрыдычныя асобы. Буйныя ўстановы Оршы прынялі пад сваё крыло сельскія клубы. Такім чынам сельскія аб'екты сталі структурнымі звёнамі больш буйных падраздзяленняў раённага цэнтра: гарадскога Палаца і Цэнтра культуры, а таксама — ДК Барані...

Такое ўзбуйненне дало магчымасць значна палепшыць матэрыяльна-тэхнічную базу СК і СДК. Па-сутнасці, дзясяткі перыферыйных аб'ектаў мы пастараліся пераўтварыць у некалькі буйных — больш мабільных і тэхнічна ўзброеных устаноў. Што пры гэтым мелі на мэце? Найперш: павышэнне якасці культурнага абслугоўвання насельніцтва. Мяркуючы па яго апытаннях, пайшлі правільным шляхам. Ды і ў вобласці наш досвед аптымізацыі ацэнены як станоўчы і карысны для ўкаранення ў іншых раёнах Віцебшчыны.

Мы здолелі захаваць раённую метадычную службу. Яе задача — падцягнуць культуру сяла да гарадскога ўзроўню. Занадта ўжо доўга мы працавалі паралельна, а не разам. Працэс аптымізацыі закрануў і музычныя школы на сяле. Яны пачалі арганізоўваць гарадскія паказальныя адкрытыя ўрокі. Інакш кажучы, сельскія работнікі культуры сталі працаваць у самым цесным кантакце з гарадскімі калегамі. Пэўным чынам вырашылася і пытанне з недахопам музычных інструментаў.

Што нам перашкаджае? Адсутнасць штатнага раскладу, які цалкам адпавядаў бы патрэбам сённяшняга часу. Нам кажуць: вырашайце пытанне на ўзроўні раённых улад. Але новыя адзінкі цяпер неабходна ўводзіць ці не ў кожную нашу структуру. Маю на ўвазе спецыялістаў-камп'ютаршчыкаў, гукарэжысёраў, рэкламшчыкаў... І вельмі хацелася б, каб працэс штатнага абнаўлення не насіў характар нейкай самадзейнасці, а меў бы сапраўднае дзяржаўнае падмацаванне.

Што нам перашкаджае? Адсутнасць штатнага раскладу, які цалкам адпавядаў бы патрэбам сённяшняга часу. Нам кажуць: вырашайце пытанне на ўзроўні раённых улад. Але новыя адзінкі цяпер неабходна ўводзіць ці не ў кожную нашу структуру. І вельмі хацелася б, каб працэс штатнага абнаўлення не насіў характар нейкай самадзейнасці...

Калі казаць пра доўгатэрміновую перспектыву развіцця, дык варта падкрэсліць, што ўдасканаленне клубнай і бібліятэчнай спраў мы будзем весці, зыходзячы з канкрэтных умоў на месцах. Ужо цяпер хтосьці адмаўляецца ад змяшаных устаноў культуры. Мы гэтага рабіць не станем. Навошта ўтрымліваць у невялічкай вёсачцы і клуб, і бібліятэку? Нерацыянальна, малаэфектыўна. Наша перспектыва, як падаецца, — у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных універсальных кадраў, здольных паказаць сябе і на клубнай сцэне, і за кафедрай кнігавыдачы.

Так, справа — надзвычай нялёгкая. У нас на сёння — толькі адна вакансія ў СДК. А што будзе заўтра?.. Варта вучыць сваіх, неабыякавых, мясцовых. Двух такіх знайшлі. Але, неаспрэчна, пошукі неабходна актывізаваць.

Цяпер у нашым раёне праходзіць рэспубліканская акцыя, звернутая супраць штучнага спынення цяжарнасці. Справа — ідэалагічная. Заняты тут ці не ўсе раённыя і абласныя структуры, грамадскія арганізацыі ды саюзы. Безумоўна, не ўбаку — і наш аддзел. Вельмі цікава прайшоў конкурс на лепшыя ўпрыгожанні для дзіцячай калясцы, рэалізаваны і праект "Пастаў свечку за ненароджанае дзіця!" ля храма Святога Леаніда. Усе сцэнарыі распрацоўваліся сіламі аддзела... Цяпер Орша працуе над адраджэннем Куцеінскай лаўры. Мы стварылі апякунскі савет, адкрылі рахунак, збіраем грошы. І гэта таксама адзін з агульнараённых праектаў, над рэалізацыяй якога працуе і наш аддзел...

Фестывальны гід

Атмасфера Гродна

Яркім і запамінальным стаўся X Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур у Культурнай сталіцы Беларусі-2014.

Фота Марка ХАРЛАМАВА і Андрэя МЯЛЕШКІ

Рэйтынг ідэй з Украіны, Італіі і Расіі

Як знайсці кнігі?

Усё большую папулярнасць ва ўсім свеце набываюць перасоўныя бібліятэкі, больш вядомыя нам як бібліобусы. У нашых суседзяў адрозніваюцца яны не толькі назвамі (букамабіль — ва Украіне, бібліямабіль — у Расіі), але і прынцыпамі дзейнасці.

Кастусь АНТАНОВІЧ

Так, напрыканцы чэрвеня па парках украінскай сталіцы пачне курсіраваць букамабіль — перасоўная бібліятэка з разнастайнай літаратурай для дзяцей і дарослых. Акрамя кніг мясцовыя жыхары змогуць тут узяць яшчэ цёплы плед, бо, як мяркуюць арганізатары праекта, так чытаць у парку будзе больш камфортна. Ужо сабрана звыш 400 кніг — ад класічнай літаратуры да дзіцячых казак: усё гэта ахвяравалі кіяўляне. Зараз вырашаецца пытанне сродку перамяшчэння. Апрача таго, неўзабаве ў Кіеве з'явяцца на вуліцах і міні-бібліятэкі. Кожны аматар кніг зможа ўзяць сабе кнігу ці пакінуць там ужо прачытаную. У "шпакоўнях", пафарбаваных у жоўты колер, будзе змяшчацца некалькі дзясяткаў кніг. Зробяць боксы і з трывалых матэрыялаў — металу ды ўдараўстойлівага акрылу — і размесцяць за метр ад зямлі.

Кніжны грузавічок Антоніа ла Кава.

У Чэлябінскай вобласці Расіі распачынае працу мультымедыйная бібліятэка на колах — бібліямабіль новага пакалення, абсталяваны спадарожнікавай інтэрнэт- платформай, ноўтбукамі, аргтэхнікай, праектарам, гукаўзмацняльным абсталяваннем з магчымасцю правядзення лекцый, культурна-масавых мерапрыемстваў і нават відэаканфэрэнцый. Фонд бібліямабіля ўключае 1000 разнастайных па тэматыцы кніг і 200 мультымедыйных выданняў на розных носьбітах. Чытачы могуць таксама карыстацца паслугамі абанемента і заказваць кнігі з цэнтральных бібліятэк. У якасці пілотнага праекта бібліямабілі пастаўлены толькі ў шэсць рэгіёнаў краіны-суседкі: Чалябінскую, Кастрамскую, Архангельскую, Валагодскую, Іркуцкую вобласці і Рэспубліку Комі.

А вось школьны настаўнік з Італіі не стаў чакаць дапамогі ад мецэнатаў ці дзяржавы. Выйшаўшы на пенсію, Антоніа ла Кава купіў трохколавы грузавічок і пераабсталяваў яго ў дзіцячую бібліятэку на колах. Падарожнічаючы на сваёй перасоўнай бібліятэцы па краіне, ён імкнецца прывіць італьянскім дзецям любоў да чытання. Усе кнігі (а іх больш за тысячу) Антоніа набыў на ўласныя грошы, выбіраючы асабіста кожную. Нездарма яго прыезд у чарговы маленькі гарадок ператвараецца ў значную падзею для дзяцей!..

К

Смачная гісторыя

Мельшпэйзы-1854 ды іншыя гарнцы

Беларускія кулінарныя кнігі: выхад са “змрочнай зоны”

“Лёгка любіць кухню, пра якую ўсе гавораць”, — сказаў мне неяк мой знаёмы кухар з Эфіопіі. “Усе чулі пра італьянскую, французскую, кітайскую і іншыя кухні, а ты паспрабуй распавесці чалавеку пра стравы той краіны, якую большасць нават не можа адшукаць на карце з першага разу”, — крыху хвалюючыся, працягваў ён. Трохі паразважаўшы, я зразумела, што Салам не так ужо і моцна памыляўся ў сваёй гастранамічнай журбоце. Канешне, для беларускага гурмана і калекцыянера кулінарных кніг, эфіопская кухня — гэта нешта вельмі далёкае і размытае ў прасторы ды геаграфіі, аднак па колькасці выдадзеных кулінарных кніг, прысвечаных кухні роднай краіны, яны і мы ўпэўнена і з камфортам працягваем займаць сваё месца ў канцы гастранамічнага эшалона.


KUCHARZ DOSKONAŁY.
Pożyteczny dla zatrudniających się GOSPODARSTWEM.
Ukazuje sposób poznawania, rozbierania i sporządzania różnego rodzaiu mięsiwa, ryb, &c. przytym naukę daje przezorną o mocy, czyli wyśmienitości warzywa i ziół, oraz o wyborze i onychże używaniu.
Tudzież robienia Wódek, Likworów, Syropów, Ciast i Cukrów.
z Francuzkiego przetłomaczony i wielą przydatkami pomnożony przez WOYCIECHA WIELĄDKA.
Edycya druga poprawiona.
Za Przywileiem.
w WARSZAWIE 1786
Nakładem i Drukiem Michała Gröllą, Księgarza Nadwornego J. K. Mci.

Пачнём з таго, што добрых кніг, прысвечаных беларускай нацыянальнай кухні, у нас надзвычай мала. Гэта факт. Тыя пяцьдзясят з паловай рэцэптаў, якія нястомныя кулінары і кухары перацягваюць з сайта на сайт, можна смела не браць у разлік. Перыядычна на кніжных развалах і на паліцах букіністычных крам вы зможаце знайсці выданні, у чыёй назве будзе ўтрымлівацца словазлучэнне “беларуская кухня”, але па факце ў большасці знойдзеце ўсё тыя ж пяцьдзясят з паловай рэцэптаў, разбаўленых прадуктамі з рэцэптурных зборнікаў для прадпрыемстваў грамадскага харчавання мінулага стагоддзя. Яшчэ ў нас хапае “лубочных” выданняў на дрэннай паперы з крыху размытым шрыфтам, але гэты зрэз кулінарнай “змрочнай зоны” можна пакінуць на сумленні ўкладальнікаў.

Яшчэ адзін пласт — энцыклапедыі і даведнікі: быццам бы інфармацыя сабрана з толкам і па справе, але сухі навуковы склад, сумны пераказ, а таксама неверагодная колькасць зносак, заўваг і ўдакладненняў, губіць практычна на корані працу разумных і, без сумневу, таленавітых людзей.

Аднак пачнем невялікі агляд кулінарных выданняў з гістарычнай часткі.

Большасць з нас памылкова лічыць, што першая беларуская кулінарная кніга — “Літоўская гаспадыня”. Насамрэч, яшчэ ў далёкім 1682 годзе пабачыла свет першая кулінарная кніга старапольскай кухні, напісаная выбітным кухмістрам свайго часу Станіславам Чарнецкім. Кніга называлася “Compendium ferculorum, або Выбраныя стравы”. У ёй прыводзяцца не толькі самыя папулярныя і любімыя стравы таго часу, але і замежныя рэцэпты. Урэшце, пра яе пісала “К” у № 8 за 2014 г.

Усе наступныя кулінарныя кнігі, будуць наўпрост ці ўскосна спасылацца на яе, а часам і проста браць з яе рэцэпты.

Наступнай па папулярнасці стала кніга Войцэха Вялёндкі “Ідэальны кухар” 1786 года. Менавіта дзякуючы ёй стане вядома пра існаванне “Compendium ferculorum…”. Паколькі аўтар шчыра прызнаецца, што менавіта пан Станіслаў аказаў на яго вялікі ўплыў і нарадзіў жаданне паспрабаваць сябе на пісьменніцкай ніве. Рэцэпты Войцэха адрозніваюцца вялікай прастатой і даступнасцю для ўсіх слаёў насельніцтва. Некалькі гадоў таму яна была перавыдадзена ў Польшчы дакладнай копіяй кнігі XVIII стагоддзя. Яе таксама можна знайсці ў Інтэрнэце на польскай мове.

І толькі потым свет убачылі знакамітая “Літоўская гаспадыня” Ганны Цюндзявіцкай і “Літоўская кухарка” Вінцэнты Завацкай. Кажуць, што часткі абедзвюх кніг былі творча перапрацаваныя ў знакамітым выданні “Подарок молодым хозяйкам”.


COMPENDIUM FERCULORUM ALBO ZEBRANIE POTRAW PRZEZ STANISŁAWA CZERNIECKIEGO KUCHMISTRZA HRABIEGO ALEXANDRA MICHAŁA LUBOMIRSKIEGO NAPISANE

“Літоўская гаспадыня” 1848 года — кніга, выдатная ў сваёй архаічнасці і цэласным, не пазбаўленым аптымізму, поглядзе на паўсядзённы побыт працавітай жанчыны. Кожная глава прысвечана асобнаму аспекту жыцця: ад парадаў пра тое, у якіх умовах трэба ўтрымліваць буйную рагатую жывёлу, да рэцэптаў догляду за сабой і вырабу памады. Кулінарная частка прадстаўлена спосабамі захоўвання сыру, бакалеяй і невялікай калекцыяй рэцэптаў для выпечкі. Не многія з нас стануць фарбаваць і адбельваць воўну ў хатніх умовах, але, пагадзіцеся, як прыемна чытаць простыя і правільныя словы, якія даюць надзею: пры правільнай арганізацыі хатняй гаспадаркі мы зможам спадзявацца на тое, што нам наканавана дасягнуць таго ўзроўню “кулінарнага дзэна”, пры якім “2 шклянкі найсвяжэйшай смятанкі, шклянку масла, 15 жаўткоў, гарнец і палавінка лепшага цукру” перастануць выклікаць трапятанне і паўстане жаданне разбірацца з мерамі і вагамі мінулага стагоддзя.

“Літоўская кухарка” 1854-га ў гастранамічным плане не ў прыклад багацейшая за папярэднія кнігі. Штодзённая і святочная кухня: штуфады, кабачкі, руляды, мельшпэйзы, супы і кашы. Частка гэтых страў нам знаёмая з дзяцінства, частку мы любім на генетычным узроўні, а сёе-тое — проста ўзята з кнігі “Compendium Ferculorum…”. Калі б у мяне спыталі, якія кнігі па гісторыі беларускай кухні варта купіць, то яна ўвайшла б у абавязковую тройку. У цяперашні момант, гэта адно з самых прыгожых і годных выданняў пра беларускую кухню, якое ў нас ёсць…

Таша ЛАПАЦЕНКА,
антраполаг гастраноміі,
ганаровы сябар і дарадца
Гільдыі шэф-кухараў Беларусі

Пра больш сучасныя кулінарныя выданні па беларускай кухні **чытайце ў наступных нумарах.**

Добрых кніг, прысвечаных беларускай нацыянальнай кухні, у нас надзвычай мала. Гэта факт. Тыя пяцьдзясят з паловай рэцэптаў, якія нястомныя кулінары і кухары перацягваюць з сайта на сайт можна смела не браць у разлік. Яшчэ ў нас хапае “лубочных” выданняў на дрэннай паперы з крыху размытым шрыфтам, але гэты зрэз кулінарнай “змрочнай зоны” можна пакінуць на сумленні складальнікаў…

Падзея

Тураўскае Евангелле: вяртанне помніка

Макет тытульнай старонкі факсіміле Тураўскага Евангелля.

У бліжэйшы час свет пабачыць факсімільнае выданне Тураўскага Евангелля — унікальнага помніка беларускай кніжнай культуры сярэдзіны XI стагоддзя.

Кастусь АНТАНОВІЧ

Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала факсімільную копію кнігі. У выданне апрача рукапісных старонак (захавалася толькі частка зводу евангельскіх гісторый для чытання ў храме) увайшлі грунтоўныя даследаванні помніка. Арыгінал Тураўскага Евангелля сёння захоўваецца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх.

Днямі фонды НББ папоўніліся таксама і лічбавай копіяй "Малой падарожнай кніжкі" Францыска Скарыны.

Акцыя

Канверт Нэмэна

Больш за трыццаць калекцый з Беларусі і Польшчы можна пабачыць на філатэлістычнай выстаўцы, што адкрылася на гродзенскім паштамце.

Мясцовыя філатэлісты прадставілі свае зборы на розныя тэмы: народныя строі і рэлігія, ровары і птушкі… А іх польскія калегі пашырылі спектр і паказалі свае зборы па спорце і раслінам. У дзень выстаўкі прайшло адмысловае гашэнне і быў паказаны канверт, на якім змешчаны профіль славутага польскага рок-музыканта, узгадаванага Беларуссю, Чэслава Нэмэна.

Маршрут веларэйду шанавальнікаў Нэмэна.

Канверт з выявай музыканта пасля гашэння ў Гродне.

Пра выстаўку распавядае сябра журы і адзін з найстарэйшых гродзенскіх філатэлістаў Лявон Карповіч:

— Я вельмі задаволены, што наш зямляк Чэслаў Нэмэн сёння ў цэнтры ўвагі вельмі многіх людзей. Цяпер на канверце мы маем яго партрэт, і гэтыя філатэлістычныя матэрыялы разыйдуцца па свеце. Я ж на выстаўку прадставіў сваю калекцыю “Біблейскія гісторыі”. Працую з вялікай зацікаўленасцю над яе папаўненнем. Праца вялікая, якая не мае канца, бо ўвесь час друкуюцца новыя матэрыялы. Я намагаюся біблейскую тэму адлюстраваць з дапамогай паштовых марак, блокаў, канвертаў і іншых філатэлістычных рарытэтаў, прычым рабіць гэта як мага паўней…

Выстаўка сабрала больш за сотню зацікаўленых гродзенцаў, а напрыканцы афіцыйнай часткі на гашэнне завіталі веласіпедысты, што ехалі з адмысловым “рэйдам” з Беластоку ў Старыя Васілішкі на Шчучыншчыне — на радзіму Чэслава Нэмэна.

Андрэй МЯЛЕШКА
Гродна
Фота аўтара

Хачу прывесці фрагмент ліста Мікалая Тараненкі, напісанага "дарагому аднапалчаніну Мішу Савіцкаму" 22 сакавіка 1987 года з горада Абінска Краснадарскага краю. Яны служылі ў адной часці. "...Калі немец цясніў нас з Мекензіевых гор і аўтаматчыкі абстрэльвалі бухту, я літаральна са шпіталя трапіў у ваш 793-ы батальён сувязі. Штаб дывізіі тады знаходзіўся на паўночным баку бухты ў штольні бензасховішча. Потым мы адкінулі ворага і выраўнялі пазіцыі. А калі пакідалі Інкерман, уначы, пры газоўцы, проста ў пуні, дзе мы размяшчаліся, нам абвясцілі, што немец абышоў нас на гары і адрэзаў ад Севастопаля. Незадоўга да гэтага мне з чатырма маракамі давялося выратоўваць Севастопальскую панараму. Ну, і потым на Херсанескім маяку раздзяліў з табой журботны лёс: трапіў у палон. У Расію вярнуўся ў 1945-м. Служыў у Смаленску, дэмабілізаваўся праз год. Але вось узнагароды за абарону Севастопаля, як і тысячы іншых яго абаронцаў, не маю..." Дарэчы, Міхаіл Савіцкі сваю першую ўзнагароду — медаль "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг." атрымаў толькі ў 1957 годзе...

Барыс КРЭПАК



Міхаіл Савіцкі.

Да апошняга патрона...

Малавядомыя старонкі
Севастопальскай эпапеі Міхаіла Савіцкага

(Працяг. Пачатак у № 23.)

З ліста ўдзельніцы абароны Севастопаля Аэліты Калугінай (ад 12 лютага 1983 года) — Міхаілу Савіцкаму: "Вітаю Вас, паважаны Міхаіл Андрэевіч! У мяне ў руках альбом з Вашай біяграфіяй і карцінамі. Дзіўна, як пераплятаюцца чалавечыя лёсы! У дні абароны Севастопаля я служыла ў 427-м медсанбаце ад 345-й стралковай дывізіі. Камісарам батальёна быў Гарэцкі. Ён тады загінуў у час бамбёжкі: яму адарвала абедзве нагі, і ў маё дзяжурства ў аперацыйнай камісар памёр. Спачатку было вельмі страшна бачыць мора крыві, крывавыя бінты, кулі і асколкі ў целах параненых. Потым усё ж прывыкла. На вайне да ўсяго прывыкаеш... Побач з нашым медсанбатам знаходзіўся медсанбат 25-й Чапаеўскай дывізіі. Гэта ў штольнях насупраць Манастырскай гары: якраз пасярэдзіне працякала мелкаводная Чорная рэчка. Пад зямлёй было ўсім вельмі цяжка. Часта без святла, без свежага паветра. Не хапала вады для параненых і персанала. Уваход у штольню пастаянна абстрэльваўся. І толькі ў рэдкія хвіліны зацішша, з рызыкай для жыцця, спускаліся да рэчкі па ваду. Бывала, урачы літаральна ля аперацыйных сталоў засыналі. Параненых было вельмі шмат, аперыравалі пры газавых лямпах. Не ведалі, калі дзень, калі ноч. Але духам мы не валіліся ад стомленасці, у істэрыку не ўпадалі — дапамагалі і песні, якія, нягледзячы ні на што, спявалі, каб узбадзёрыцца і не заснуць.

Я прайшла амаль той жа шлях палону, што і Вы: Херсанескі маяк, Бахчысарай, Сімферопальская турма, Германія. Потым былі Нідэрланды, рэкі Маас, Рэйн, лагер 365-га шталага пад №76. Вызвалілі саюзнікі 1 красавіка 1945 года. Да роднай хаты вярнулася 1 студзеня 1946-га. Вельмі ўсхвалявалі мяне Вашы карціны, асабліва "Адбор" з серыі "Лічбы на сэрцы". У ёй, можна сказаць, я пазнала сябе і сваіх сяброўак: іх ужо няма у жывых. А было нам тады па 17-18 гадоў. Я ўсё так добра помню, быццам бы гэта было толькі ўчора, і не дай божа, каб мінулае паўтарылася зноў... Зараз жыву ў Севастопалі. Горад адбудаваўся, стаў лепшым і больш прыгожым. Прыязджайце, дарагі Міхаіл Андрэевіч, да нас пагасціць! Бо Вы пакінулі тут часцінку сваёй душы..."

...Дзесьці побач з Савіцкім ля Херсанескага маяка вялі бой да апошняга патрона маракі-чарнаморцы Уладзімір Мішчанка, Васіль Кабец і Іван Зора, а таксама аднапалчане — Георгій Валавік і Аляксандр Грышын. Усе яны, на шчасце, ацалелі ў полымі вайны і, адшукаўшы Савіцкага, праз дзесяцігоддзі пасля Перамогі, вялі з ім перапіску.

З ліста У.Мішчанкі — М.Савіцкаму ад 18 лютага 1985 года: "Дарагі баявы сябра па Севастопалі і Херсанесе Міхаіл Андрэевіч, прывітанне! Мы, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, абаронцы Севастопаля і Херсанеса з 41-га марскога шпіталя, марской авіяцыі і падводна-надводных караблёў Чарнаморскага флота, канешне, жадалі б бачыць сябе, як у 1941 — 1942 гадах — маладымі і прыгожымі, храбрымі і мужнымі, баявымі і вернымі Радзіме.

Усе мы прайшлі вучэбны атрад ("саракатрубны лінкор") і ў Херсанесе маглі сустрэцца з вамі. Асноўны склад наш — гэта тыя, хто прыкрываў адыход ад Севастопаля пад скаламі на Херсанесе да 17 ліпеня 1942 года. Сярод нас удзельнікі першага ў Вялікай Айчыннай вайне дэсанта з паветра пад Адэсай у ноч на 22 верасня 41-га года, а потым прыкрываўшыя адыход камандавання ў ліку 600 чалавек Севастопальскага абарончага раёна. Ёсць тыя, хто цудам засталіся жывымі, якія прайшлі праз пакуты ада фашысцкіх канцлагераў. Пра многіх з нас напісана ў кнігах і іншых выданнях, але, на жаль, там мы сябе не пазнаём. Там мы — перафарбаваны ў ружовыя таны. А патрэбна праўда і толькі праўда..."

Далей у лісце ішла пераканаўчая просьба да мастака напісаць "праўдзівую" карціну пра севастопальцаў: "Яе рэпрадукцыю мы гатовы размножыць і распаўсюдзіць па усім свеце і яго наваколлях. Пакуль чакаем ад Вас эскіз такой карціны..." Для Міхаіла Савіцкага гэта быў першы сігнал да таго, каб прыступіць да палатна "Клятва севастопальцаў", якое і было закончана ў тым жа, 1985-м годзе. Сюжэтны матыў карціны быццам бы не новы: ваенныя маракі развітваюцца з забітым сябрам. Знешне яна зусім статычная. Колькі-небудзь разгорнутага дзеяння ў ёй не адбываецца. Дэталі выбраны скупа і не складваюцца ў паслядоўнае, развітае ў часе апісанне, якое іншым разам служыць у жывапісе асобай формай сюжэтнага апавядання. Колерарытміка тут строга размеркаваная: трывожны барвова-чорны фон палаючага Севастопаля; твары маракоў, якія асвечаны змярцвела-залацістым сонечным святлом; цела загінулага матроса ў белым бушлаце, прыкрытае палотнішчам пунсовага сцяга, — усё працуе на сапраўдны драматызм таго, што адбываецца. Разам з тым, спакойна-мужная інтанацыя карціны ў цэлым, даволі шырокі эмацыянальны дыяпазон не даюць адчування безвыходнасці, як бы першапачаткова закладзеных у раскрыцці аналагічных "далікатных" тэм, звязаных з пахаваннямі. Тут, у назве карціны, сэнсавае ключавое слова — "клятва". Менавіта клятва, а не проста "плач" па загінулым. Клятва вернасці памяці таварыша, клятва Радзіме, за якую маладыя хлопцы аддавалі свае жыцці...

З ліста тых жа аднапалчан — М.Савіцкаму ад 21 красавіка 1985 года: "Тваё паведамленне пра тое, што карціна "Клятва севастопальцаў" гатовая, нас вельмі ўсцешвае. Мы чакаем фатаграфію альбо плёнку. Раздрукуем для тых херсанесцаў, хто застаўся ў жывых (ох, як мала нас засталося!). Думаем, Міша дарагі, ты не пакрыўдзішся за тое, што мы спяшаемся? У нас ужо няма часу, часу ў абрэз — многіх не стала ў апошні гэты год..."

...А цяпер перавядзем дух і вернемся трошкі назад. За сем месяцаў да палону Савіцкага, у пачатку снежня 1941-га, групу чырвонаармейцаў і курсанатаў з Грозненскага авіявучылішча ўключылі ў склад 793-га асобнага батальёна сувязі 345-й стралковай дывізіі пад камандаваннем палкоўніка Мікалая Гузя. У гэтую дывізію ўваходзілі сем палкоў, два дывізіёны, шэсць батальёнаў, лазарэт, рота хімічнай абароны, хлебапякарня, палявая паштовая станцыя і палявая каса дзяржбанка. Фарміравалася дывізія восенню 1941 года ў Паўночна-Асецінскай і Дагестанскай ССР Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі ў складзе 44-й арміі Закаўказскага фронта ў мэтах абароны Чарнаморскага ўзбярэжжа і прызначалася для высадкі першага эшалона ў Феадасійскай дэсантнай аперацыі. Такая аперацыя адбылася за два тыдні да новага 1942 года. У ёй удзельнічаў і чырвонаармеец Міхаіл Савіцкі. Трошкі пазней, у лютым наступнага года, ён быў прызначаны намеснікам камандзіра (па камсамольскай рабоце) 793-га асобнага батальёна сувязі.

Дэсант у ліку прыкладна 10 тысяч чалавек на цеплаходах "Калінін", "Дзімітраў", "Сяроў", "Курск", "Фабрыцыус" і "Чырвонагвардзеец" быў перакінуты на абарону Севастопаля, каб змагацца ўжо ў складзе Прыморскай арміі Каўказскага фронта. Гэты фронт, які на кароткі тэрмін стаў Крымскім, з 20 мая па ліпень 1942 года ўжо называўся Паўночна-Каўказскім. І радавы Міхаіл Савіцкі апынуўся сярод тых, хто, пачынаючы з зімы 1941-га і да канца чэрвеня наступнага года на працягу больш за 200 сутак мужна абараняў галоўны чарноморскі порт краіны, блакіраваны немцамі з сушы і мора, штодзённа і штоночна знаходзячыся на мяжы жыцця і смерці. Абараняў да самага падзення Севастопаля, гэта значыць да пачатку ліпеня 1942-га — практычна да таго часу, калі яго родная 345-я стралковая дывізія, паспеўшы ўтапіць свае баявыя сцягі ў Чорным моры, была поўнасцю знішчана ворагам...

Шмат гадоў таму, у 1980-я, Міхаіл Андрэевіч расказаў мне пра вялікую крымскую трагедыю шмат такога, што, па яго славах, "раней агучваць было нельга". Ды і пра многія абставіны гэтай гісторыі, якія старанна хаваліся ваеннымі гісторыкамі і партыйнымі ідэолагамі, Савіцкі сам даведаўся ўжо ў час "перабудовы" і "галоснасці", калі пачала выяўляцца горкая праўда пра тое, што на самой справе адбылося ў Севастопалі ў 1941 — 1942 гадах. Тым не менш Міхаіл Андрэевіч прасіў мяне пакуль не пісаць у прэсе паведамленае: "Не надрукуюць — час яшчэ не прыйшоў. Да таго ж, трэба сёе-тое пераправерыць..."

Толькі сёння дакументы прыадкрылі факты. А тады... Адкуль яму, простаму чырвонаармейцу, было ведаць, што насамрэч адбывалася ў вярхоўных эшалонах улады і кіраўніцтве непасрэднай абаронай Крыма? Адкуль ён мог ведаць, што яшчэ 30 ліпеня паў Малахаў курган і камандуючы абаронай Севастопаля віцэ-адмірал Філіп Акцябрскі слёзна папрасіў дазволу Стаўкі ВГК на тэрміновую эвакуацыю. Але план гэтай эвакуацыі прадугледжваў вываз на самалётах, падводных лодках і катэрах толькі вышэйшага складу з ліку камандавання арміяй і флотам, партактыва... Эвакуацыі астатняй часткі ваеннаслужачых (а іх — дзясяткі тысяч), у тым ліку цяжка параненых, не дапускалася!

Адкуль салдат Савіцкі мог ведаць, што ў казематах 35-й берагавой батарэі 30 ліпеня 1942 года прайшло апошняе пасяджэнне Ваеннага Савета штаба Прыморскай арміі па "далейшай арганізаванай абароне раёна"? Што пасля пасяджэння віцэ-адмірал Акцябрскі і яго памочнікі, старшыя афіцэры і палітработнікі, укрыўшыся плашчамі, спусціліся пад зямлю на глыбіню 30 метраў, а потым па падземным паўкіламетровым праходзе дабраліся да апошняга паста батарэі. Там непрыкметна падняліся па лесвіцы, моўчкі селі ў загадзя падрыхтаваныя машыны і паімчалі на аэрадром Херсанес, а адтуль на самалёце Лі-2 вылецелі ў Краснадар...



Арыгінал ліста Аэліты Калугінай да Міхаіла Савіцкага.

Працяг Севастопальскай эпапеі Міхаіла Савіцкага чытайце **ў наступных нумарах.**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- Выстаўка аднаго твора — фатаграфіі **"Лятучка"** Юрыя Іванова.
- Выстаўка **"Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі"** — да 10 ліпеня.
- Выстаўка твораў Віктара Кліменкі **"Мы толькі вандроўнікі"** — да 16 чэрвеня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."



г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".**
- **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".**
- **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Персанальная выстаўка **Аляксандра Рыжэўскага,** майстра разьбы па шкарлупіне яйка.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.
- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
- **"Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".**

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Алімпійская Беларусь"** — да 22 чэрвеня.
- Выстаўка **"Галаграфія-2014. Мінск"** — да 6 ліпеня.
- Фотавыстаўка работ Катрын Дэамброзіс **"Мерал: Французская глыбінка"** — да 30 чэрвеня.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП



г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Сектар"**, прысвечаная спартыўнай тэматыцы.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Беларусь сакральная"** — да 27 ліпеня.
- Выстаўка фотаапаратаў **"Настальгія"** — да 31 ліпеня.

Ратуша
- Пастаянная экспазіцыя.

Інфармацыйна-касавы цэнтр
- Выстаўка **"Смак беларускай гісторыі"** — да 31 ліпеня.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка фатаграфій **"Мір стары — Мір новы"**.

Слановая зала
- Выстаўка з прыватнай калекцыі І.Сурмачэўскага **"Дух часу і раскошы: мода і стыль 1820 — 1920-х гадоў"** — да 15 жніўня.

Партрэтная зала
- **"Выстаўка партрэтаў князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** (Германія) — да 16 лістапада.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра".**
- Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.

Акцыі:
- **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
- **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
- Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Спорт у жыцці сям'і Міцкевічаў"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:
- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
- Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстаўка:
- Выстаўка **"Для тых, якіх люблю"** — з 18 чэрвеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10.
- **"Back in BSSR / Ізноў у БССР"** (савецкі плакат 1940 — 1980-х гг., прадметы матэрыяльнай культуры) — да 14 верасня.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска:

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл.Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
- **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганараваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўка:
- Выстаўка жывапісу Алега Арлова і Аляксандра Ісачова — да 26 чэрвеня.
- Выстаўка прыватнай калекцыі гальштукаў Ёзаса Шаўкаўскага **"Кожны дзень — новы гальштук"** — да 29 чэрвеня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл.Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстаўка:
- Выстаўка дзіцячага малюнка і плаката, прымеркаваная да Сусветнага дня бежанцаў, **"Будзем разам"** — да 22 чэрвеня.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
- **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры к. XIX — с. XX стст.

Выстаўка:
- **"Куфэрак: стагоддзе прыгажосці"** — рэканструкцыя касцюмаў XIX — да 28 верасня.

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, пр-т Ракасоўскага, 49. Тэл.: 291 16 76.

Экспазіцыі:
- **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Л.Шчамялёва".**

Выстаўка:
- Фотавыстаўка Наталлі Юніцкай-Асіпенка **"Яднанне"** — да 21 чэрвеня.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- *Упершыню на Беларусі!* **"Цмокі і васковыя фігуры"** (скульптуры драконаў і герояў фэнтазі, а таксама гістарычныя персанажы царскай сям'і Раманавых) — да 31 жніўня.
- Выстаўка карлікавых дрэў **"Бансай — музыка, застылая ў вецці"** — да 22 чэрвеня.
- Выстаўка матылькоў **"Лятаючыя кветкі"** — да 17 чэрвеня.
- Скарбы сусветнага жывапісу ва ўнікальнай калекцыі рэпрадукцый **Надзеі Лежэ** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь — да 31 жніўня.

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня".**
- **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:
- **"Створаныя эпохай Румянцава"** (літаратурная выстаўка 2-й пал. XVIII — 1-й чвэрці XIX стст. са збору графа М.П. Румянцава) — да 24 чэрвеня.
- **"Класікі беларускага мастацтва".**

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад
Свет субтрапічных раслін і жывёл.

Пандус Палаца Румянцавых і Паскевічаў
- **"Летнія музычныя асамблеі"** — з 7 чэрвеня.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.
- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі".**
- Лакальная экспазіцыя **"Ваенна-санітарны вагон"** — да 30 верасня.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
- Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна...".**
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны".**
- **"Прывітанне, раней-шая Ліда!".**
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.
- **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
- Выстаўка **"Як жылі нашы продкі"**.
- Выстаўка **"Чарадзейны Куфар"**.
- Выстаўка творчых работ выпускнікоў і выкладчыкаў мастацкай школы **"Сустрэча пакаленняў"**.
- Персанальная выстаўка П.Цімафеева **"Драматычнасць сярэдняга плана. Час жывых"**.
- У рамках праекта "Выток Нёмана — выток духоўнасці" — калектыўная выстаўка **"Абуджэнне"**.
- Выстаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці А.Чуўюравай (Сярко) **"Частка маёй душы".**
- **"Вайны свяшчэнныя старонкі"** — выстаўка, прысвечаная Вялікай Перамозе.
- Фотавыстаўка С.І. Котава **"Праўнукі Перамогі"**.

Лідскі замак
- Камера пытак.
- Фотавыстаўка **"Захаваем на вякі".**
- Партрэтная галерэя Вялікіх Князёў і Каралёў.
- Фотавыстаўка **"Археалагічныя знаходкі Лідскага замка".**
- Выстаўка рэплік **"Зброя Вялікага княства".**

ГАЛЕРЭІ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1. Тэл.: 327 26 12.
- Арт-праект Васіля Зянько **"EX NIHILA"** — да 21 чэрвеня.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 288 15 49.
- Персанальная выстаўка Д.Сарокі **"Краявіды Міншчыны"** — да 15 чэрвеня.
- Выстаўка твораў В.Касцючэнкі **"Зямляне"** — да 15 чэрвеня.
- Выстаўка да 150-годдзя паўстання Кастуся Каліноўскага **"Памяць іх цэняць"** — да 15 чэрвеня.
- Выстаўка твораў **Н.Чарнагаловай.**
- Персанальная выстаўка **М.Голубевай.**
- **"Заазёрная сядміца".**

ШТОТЫДНЁВАЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Рэдакцыя
Рэдактары аддзелаў: **Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН**
Аглядальнікі рэдакцыі: **Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ**
Спецкарэспандэнты: **Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Вольга НАВІЦКАЯ**
Загадчык аддзела фотаілюстрацый — **Юрый ІВАНОЎ**
Мастацкі рэдактар — **Наталля ОВАД**
Карэктар — **Інга ЗЕЛЬГІС**

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by
E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2014.
Індэксы 63875, 638752
Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Наклад 6377
Падпісана ў друк 13.05.2014 у 15.00
Замова 2467
Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва" 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Прыёмная: (017) 290 22 50.
Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35

QR-код:

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
- **15** — **"Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж.Бізэ.
- **16** — **"Спартак"** (балет 3-х дзеях) А.Хачатурана.
- **16** — **"Толькі шчасце кахання"**— Музычныя вечары ў Вялікім (Камерная зала імя Л.П. Александроўскай). Пачатак у 19.30.
- **17** — **"Травіята"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Вэрдзі.
- **18** — **"Карміна Бурана"** К.Орфа; **"Кармэн-сюіта"** Ж.Бізэ — Р.Шчадрына.
- **19** — **"Алека"** С.Рахманінава; **"Балеро"** М.Равэля.
- **20** — Вечар балета **"Са стагоддзя XIX у стагоддзе XXI"** ("Па-дэ-карт", "Свята кветак у Чынзана", Па-дэ-пасіс з балета "Эсмеральда", "Серэнада", "Шэсць танцаў"). Пачатак а 20-й.

Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў
- **20** — **"Мелодыі кахання"** — канцэрт з удзелам Т.Траццяк і струннага квінтэта "Серэнада". Пачатак а 16-й.
- **20** — **"Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж.Бізэ. Пачатак у 21.30.
- **21** — **"З Ойчам адвечным"**— канцэрт з твораў С.Манюшкі. Пачатак а 16-й.
- **21** — Вечар балета **"Са стагоддзя XIX у стагоддзе XXI"**. Пачатак у 21.30.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 327 60 81.
- **15** — **"Людзі на балоце"** І.Мележа.
- **19** — **"Старамодная камедыя"** А.Арбузава.
- **20** — **"Вечар"** А.Дударава.

На Малой сцэне Канцэртнай залы "Мінск"
- **17, 18** — **"Старамодная камедыя"** А.Арбузава.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.
- **16** — **"Нямое каханне"** — аўтарскі праект Ігара Сігова.
- **17** — **"Адамавы жарты"** С.Навуменка.
- **18** — **"Інтымны дзённік (Дзённік паэта)"** С.Кавалёва.
- **19** — **"Ліфт"** Ю.Чарняўскай.
- **20** — **"Французскі вуаяж"** (тэатральныя замалёўкі).
- **21** — **"Эмігранты"** С.Мрожака.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.
- **15** — **"Праўдзівая гісторыя паручніка Ржэўскага"** У.Баскіна.
- **17** — **"Аднойчы ў Чыкага"** Дж.Стайна, Г.Мілера, Дж.Кандэра і інш.
- **18** — **"Сільва"** І.Кальмана.
- **19** — **"Лятучая мыш"** І.Штраўса.
- **20** — **"Містар Ікс"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Кальмана.